Аляксандр Гужалоўскі

# Сэксуальная рэвалюцыя ў Савецкай Беларусі ў 1920-я гг.: Ідэйныя вытокі і юрыдычнае абгрунтаванне

Przegląd Środkowo-Wschodni 2, 9-59

2017

Artykuł został opracowany do udostępnienia w internecie przez Muzeum Historii Polski w ramach prac podejmowanych na rzecz zapewnienia otwartego, powszechnego i trwałego dostępu do polskiego dorobku naukowego i kulturalnego. Artykuł jest umieszczony w kolekcji cyfrowej bazhum.muzhp.pl, gromadzącej zawartość polskich czasopism humanistycznych i społecznych.

Tekst jest udostępniony do wykorzystania w ramach dozwolonego użytku.

MUZEUM HISTORII POLSKI

Przegląd Środkowo-Wschodni, 2, 2017
ISSN 2543-618X

**Аляксандр Гужалоўскі**
Кафедра этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў
гістарычнага факультэта
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
huzhalouski@gmail.com

# Сэксуальная рэвалюцыя ў Савецкай Беларусі ў 1920-я гг.: Ідэйныя вытокі і юрыдычнае абгрунтаванне

**Rewolucja seksualna na Białorusi Sowieckiej w latach dwudziestych XX wieku: geneza ideowa i ustawodawstwo**

Wszystkie istniejące w XX wieku reżimy totalitarne próbowały wykorzystać energię seksualną społeczeństwa do swoich celów politycznych traktując ją jako narzędzie inżynierii socjalnej. W Związku Sowieckim ideolodzy partyjni dążyli do dopasowania zachowań seksualnych ludzi do doktryny marksistowskiej. Seksualność w ZSRS pokonała długa drogę od zakrojonych na szeroką skalę swobód w latach dwudziestych przez konserwatyzm epoki stalinowskiej i względną liberalizację w dobie„realnego socjalizmu" do prawdziwej eksplozji na przełomie lat osiemdziesiątych i dziewięćdziesiątych. Pierwszą dekadę po objęciu władzy przez bolszewików cechowały szerokie swobody w dziedzinie życia seksualnego. Zmiany, które wówczas się dokonały, przeszły do historii jako„rewolucja seksualna". Wiele aspektów tej rewolucji już stanowiło przedmiot badań rosyjskich i zachodnich badaczy. Tymczasem badacze białoruscy w swoich pracach zaledwie poruszali niektóre epizody związane z sowiecką rewolucją seksualną. Przy czym badacze ci tradycyjnie wpisywali ją w nurt ówczesnej sowieckiej polityki narodowościowej i NEP-u. W przeciwieństwie do nich autor danej publikacji podjął próbę spojrzenia na rewolucję seksualną z lat dwudziestych przez pryzmat tworzenia nowej ideologii i prawa regulującego postawy i zachowania seksualne społeczeństwa. W latach dwudziestych bolszewicy przeprowadzali swoisty eksperyment, wówczas

trwała transformacja relacji pomiędzy obydwoma płciami. W ówczesnej prasie oraz z trybun dygnitarze partyjni i państwowi otwarcie omawiali sferę seksualną życia obywateli.
Słowa kluczowe: rewolucja seksualna, ideologia, gender, moralność, relacje małżeńskie, marksizm, miłość, ustawodawstwo, kodeks rodzinny, małżeństwo, rozwód

## Уводзіны

Базавыя інстынкты чалавека, у тым ліку сэксуальны, ніводная чалавечая цывілізацыя не была здольная забараніць ці адмяніць. Тым не менш, усе цывілізацыі выпрацоўвалі сістэмы рэгулявання сэксуальнага інстынкту ў выглядзе маральных і юрыдычных забаронаў. Таталітарныя дзяржавы, што існавалі ў ХХ стагоддзі, пайшлі далей і паспрабавалі выкарыстаць сэксуальную энэргію насельніцтва – гэты адвечны рухавік – як інструмент сацыяльнага праектавання. У СССР сэксуальнасць і сэксуальныя паводзіны людзей імкнуліся змяніць ў залежнасці ад змены правіцелей і палітычнага курса краіны. Сэксуальнасць у Савецкім Саюзе прайшла цыкл ад нечуванай свабоды 1920-х гг. праз кансерватызм эпохі сталінізму і адносна ліберальныя дзесяцігоддзі “развітога сацыялізму” да сэксуальнага бума канца 1980-х – пачатку 1990-х гг.[1]

Першая сусветная вайна паўплывала на пераасэнсаванне ўсіх традыцыйных поглядаў на гендэр, сэксуальныя паводзіны людзей. Мабілізацыі, бежанства, доўгатэрміновае размяшчэнне на тэрыторыі Беларусі вялікіх вайсковых кантынгентаў прывялі да размывання традыцыйных уяўлення пра сэкс і мараль. Кастрычніцкая рэвалюцыя выклікала далейшую дэзарганізацыю сямейных і ма-

[1] У сучаснай Беларусі каля 50% шлюбаў сканчаюцца разводамі, каля 20% цяжарнасцяў – абортамі, нараджальнасць на адну жанчыну складае каля 1,6 дзіцяці, што разам з ранняй мужчынскай смяротнасцю і эміграцыйнымі працэсамі абумовіла скарачэнне насельніцтва краіны за апошнюю чвэрць стагоддзя амаль на 800 тыс. чалавек. *Статистический ежегодник. Республика Беларусь,* Минск 2015, 524 с.

ральных каштоўнасцяў, павелічэнне пазасямейнай арыентацыі, а таксама дэструкцыю формаў сацыяльнага кантролю за сэксуальнасцю. Разам з лозунгамі сацыяльнага і эканамічнага вызвалення працоўных, бальшавікі прынеслі ў спустошаную Першай сусветнай вайной Беларусь ідэі вызвалення сэксуальнасці і разняволення жанчыны.

Сацыяльна-эканамічныя ўмовы, у якіх праводзіўся эксперымент па пабудове новых калектыўных форм жыцця людзей, былі далёкія ад ідэальных. На працягу ўсяго перыяду правядзення новай эканамічнай палітыкі (НЭП), эканоміка рэспублікі захоўвала аграрны характар. Нягледзячы на перадумовы да развіцця, сельская гаспадарка была даволі адсталай, прамысловасць мела напоўкустарны характар. Дэмакратызацыя грамадска-палітычнага жыцця, а таксама палітыка беларусізацыі, што праводзіліся ва ўмовах аднапартыйнай сістэмы, мелі абмежаваны характар. Пошукі новых сямейна-шлюбных форм адбываліся на фоне барацьбы за “новы быт”, які разглядаўся ў якасці найважнейшай умовы раўнапраўнага становішча жанчыны.

З мэтай разбурэння традыцыйнай сям’і, у якой бальшавіцкія ідэолагі бачылі адну з галоўных перашкодаў на шляху пабудовы камуністычнага грамадства, пачынаючы з 1917 г. пачала праводзіцца палітыка дзяржаўнага фемінізму. У яе рамках ажыццяўлялася адмаўленне ад традыцыйных сямейна-шлюбных адносінаў, іх перафармаціраванне адпаведна новай сацыялістычнай маралі, а таксама эмансіпацыя жанчын.

Рэвалюцыйныя змены ў сэксуальных адносінах, што адбыліся ў СССР на працягу першага паслярэвалюцыйнага дзесяцігоддзя варта разглядаць у сусветным кантэксце. а менавіта: у рэчышчы радыкальнай мадэрнізацыі і разрыва з традыцыйнымі каштоўнасцямі, якія ўвайшлі ў культурную гісторыю пад назвай “равучых (або вар’яцкіх) дваццатых”. У той час у еўрапейскім і паўночнаамерыканскім грамадстве пад уплывам тэорыі З. Фрэйда распаўсюдзілася думка пра тое, што палавое жыццё патрэбна жанчынам

не менш за мужчын, а падаўленне сэксуальных жаданняў разбуральнае для псіхікі. Першая сусветная вайна прывяла да масавага скарачэння мужчынскай часткі насельніцтва, а таксама перамогі фемінстак, якія значна пашырылі канстытуцыйныя правы жанчын, змянілі менталітэт і паводзіны апошніх. Новае пакаленне жанчын 1920-х гадоў імкнуліся сумясціць сямейнае жыццё з прафесійнай кар'ерай. Гэта адбілася на іх знешнім абліччы ў выглядзе кароткіх стрыжак, вузкіх спадніц, нагавіц, а таксама касметыкі, якую раней ужывалі пераважна актрысы і прастытуткі. На працягу "равучых дваццатых" палагоднелі адносіны да сэксуальных меншасцяў.

Кардынальная змены адносінаў паміж паламі, якая адбывалася ў СССР на працягу 1920-х гадоў у сусветнай гістарыяграфіі атрымала назву "сэксуальнай рэвалюцыі"[2]. Пад гэтым паняццем сёння звычайна разумеецца працэс і вынікі карэннай ломкі традыцыйных каштоўнасцяў, арыентацый, норм і адносінаў у інтымнай і сямейна-шлюбнай сферы.

Паняцце "сэксуальная рэвалюцыя" у канцы 1920-х гг. упершыню было ўведзена ў навуковы зварот вучнем З. Фрэйда, аўстрыйскім і амерыканскім псіхолагам, камуністам В. Райхам. Распрацаваўшы гэтае паняцце ў рамках псіхааналітычнай парадыгмы, ён даў яго тлумачэнне як працэса вызвалення прыгнечанай, дэфармаванай перш за ўсё эканамічнымі адносінамі сэксуальнай (альбо "аргоннай", паводле яго тэорыі) энергіі. Пры гэтым, В. Райх падкрэсліваў, што вынікам сэксуальнай рэвалюцыі павінна быць не ўседазволенасць і анархія ў інтымнай сферы жыцця людзей, але псіхалагічнае разняволенне асобы і грамадства.[3] Зусім іншае, выключна негатыўнае разуменне феномена "сэксуальнай рэвалюцыі", як працэса паступовай трансфармацыі "homo sapiens" у "homo sexual" прапанаваў у сярэдзіне XX ст. рускі і амерыканскі сацыёлаг П.А. Саро-

---

[2] Гл. напр.: G. Carleton, *Sexual Revolution in Bolshevik Russia,* University of Pittsburgh Press 2005, 288 p.

[3] В. Райх, *Сексуальная революция*, Москва 1997, 352 с.

кін.[4] Новая канцэпцыя "сэксуальнай рэвалюцыі" як культурнага феномена, з улікам сацыякультурных змен, што адбыліся на Захадзе ў 1960–70-х гадах, была распрацавана аўстрыйскім і англійскім філосафам і псіхааналітыкам Дж. Франклам[5].

Згаданыя працы былі заўважаны і выкарыстаны ў якасці метадалагічнага падмурка для даследавання розных аспектаў сэксуальнай рэвалюцыі 1920-х гадоў у СССР прадстаўнікамі гістарычнага цэху, спачатку – заходняга[6], а потым – усходнееўрапейскага[7]. Водгукі сэксуальнай рэвалюцыі 1920-х гадоў мы

---

[4] П. Сорокин, *Американская сексуальная революция*, Москва 2006, 152 с.

[5] G. Frankl, *The failure of the sexual revolution*, London 1975, 192 c.

[6] Ф. Навай, *Советская модель*, [w:] История женщин на Западе. Становление культурной идентичности в XX столетии», red.: Ф. Тебо, Санкт-Петербург 2015, т. 5, с. 263–288; Р. Стайтс, *Женское освободительное движение в России. Феминизм, нигилизм и большевизм. 1860–1930*, Москва 2004, 616 с.; Д. Хили, *Гомосексуальное влечение в революционной России. Регулирование сексуально-гендерного диссидентства*, Москва 2008, 648 с.; K. Bailes, *Alexandra Kollontai et la Novelle Morale*, "Cahiers du monde russe et sovietique", 1965, vol. 6, №. 10–12, p. 472–496; V. Calverton, *The Bankruptcy of Marriage*, New York 1928, 341 p.; S. Fitzpatrick, *Sex and Revolution: An Examination of Literary and Statistical Data on the Mores of Soviet Students in the 1920s*, "Journal of Modern History", 1978, vol. 50, p. 252–278; F.W. Halle, *Women in the Soviet East*, London 1938, 363 p.; M. Stern, A. Stern, *Sex in the Soviet Union*, London 1981, 224 p.; A. Willimott, *The Kommuna Impulse: Collective Mechanisms and Commune-ists in the Early Soviet State*, "Revolutionary Russia", 2011, № 1 (24), p. 59–78 і інш.

[7] О. Дорохина, Влечение в законе. *Брачное законодательство первых лет советсткой власти*, «Родина: Российский исторический журнал», 2009, № 5, с. 107–109; И.С. Кон, *Клубничка на березке. Сексуальная культура Росии*, Москва 2010, 608 с.; Н. Лебина, *Советская повседневность: нормы и аномалии. От военного коммунизма к большому стилю*, Москва 2015, 488 с.; О. К. Міхеєва, *Проблеми шлюбних відносин у контексті радянської сімейної політики в Україні на початку 1920-х рр. (за матеріалами газет та фахових юридичних часописів)*, "Історичні та політологічні дослідження", 2013, № 4 (54), с. 128–133; Т. Осипович, *Проблемы пола, брака, семьи и положение женщины в общественных дискуссиях середины 1920-х гг.*, "Общественные науки и современность", 1994, № 1, с. 166–171; А. М. Пушкарев, *"Новый быт": идеологические интерпретции сексуального (по материалам русской художественной литературы и критики 1920-х годов*, "Журнал исследований социальной политики", 2007, т. 5, № 4,

знаходзім на старонках прац некаторых беларускіх вучоных, што даследуюць гендэрныя аспекты мінуўшчыны[8]. Аднак у якасці са-

с. 459–482; А. Пушкарев, Н. Пушкарева, *Ранняя советская идеология 1918–1928 годов и "половой вопрос" (о попытках регулирования социальной политики в области сексуальности)*, [w:] *Советская социальная политика 1920–1930-х годов: идеология и повседневность*, red.: П. Романов и Е. Ярская-Смирнова, Москва 2007, с. 199–227; Л. І. Слюсар, *Модернізація шлюбу і сім'ї в Україні: особливості радяньского періоду*, "Демографія та соціальна економіка", 2013, №1(19), с. 17–27; В. Д. Сутрин, Н. М. Доропий, *Проблемы брачно-семейных отношений и полового воспитания в первые годы советской власти*, "Наукові записки Ніжинського державного університету ім. М. Гоголя. Сер. : Психолого-педагогічні науки", 2013, № 5, с. 261–266; А. Ю. Рожков, *В кругу сверстников: Жизненный мир молодого человека в Советской России 1920-х годов*, Москва 2014, 640 с. і інш.

[8] Е. Гапова, *Между войнами: женский вопрос и национальные проекты в Советской Белоруссии и Западной Беларуси*, [w:] *Гендерные истории Восточной Европы*, red.: Е. Гапова, А. Усманова, А. Пето, Минск 2002, с. 100–123; А. Д. Грыгор'еў, *Барацьба з праявамі сацыяльнай паталогіі на Беларусі, (1917−1941 гг.)*, "Весці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта", 2002, № 2, с. 112−116; А. Гужалоўскі, *Замах на сям'ю: сексуальная рэвалюцыя 1920-х г. у БССР на старонках перыядычнага друку*, "Беларускі гістарычны агляд", 2015, т. 22, сш. 1–2 (42–43), с. 89–123; А. Гужалоўскі, *Прастытуцыя ў БССР у часы НЭПа*, "Arche", 2015, № 9 (142), с. 243–266; А. А. Гужалоўскі, *Сацыяльна-ўтапічны эксперымент: вопыт арганізацыі маладзёжных камун у БССР*, "Беларуская думка", 2016, № 1, с. 70–76; А. Н. Дулов, *Брак, семья, материнство в государственной политике БССР 1920-х – первой половины 1930-х гг.*, [w:] *Женщины в истории: возможность быть увиденными*, red.: И. Р. Чикалова, Минск 2004, вып. 3, с. 218–235; А. Н. Дулов, *Проституция и борьба с ней в Витебске в первые годы Советской власти* [w:] *Женщина. Образование. Демократия: материалы 3-ей международной междисциплинарной научно-практической конференции (8–9 декабря 2000 г.)*, Минск 2001, с. 297–299; В. Жыбуль, *Адлюстраванне праблемы абортаў і прастытуцыі ў беларускай савецкай літаратуры 1920–30-х гг. XX ст.*, [w:] *Terra alba. Homo Venerus: Сэксуальная прастора беларускай культуры*, red.: С. І. Даніленка, Мінск, 2001, с. 186–193; В. Жыбуль, *Сэксуальны гвалт у беларускай савецкай літаратуры*, [w:] *Terra alba. Homo Venerus: Сэксуальная прастора беларускай культуры*, red.: С. І. Даніленка, Мінск, 2001, с. 179–186; И. Курков, *"Безработица является поводом для проституции" (из документов женотдела ЦК КП(б)Б 1920-х гг.)*, [w:] *Женщины на краю Европы*, red.: Е. Гапова, Минск 2003, с. 130–144; И. Курков, *Гендерный строй белорусской деревни*, "Иной взгляд", 2000, март, с. 25–26; И. В. Лавриновская, *Трансформация*

мастойнага абъекта даследавання беларускія даследчыкі гэтую праблему не разглядалі.

## Уключэнне сямейна-шлюбных адносін ў сацыялістычную праграму

Адносіны да сэкса ў еўрапейскім грамадстве да пачатку XX ст. базаваліся перш за ўсё на сплаве традыцыйнай і хрысціянскай маралі. У такіх грамадствах сэкс быў табуіраванай тэмай, ён быў непрыймальны па-за шлюбам, як непрыймальныя былі таксама кантрацэптывы і аборты. Развіццё навуковых ведаў, падзенне аўтарытэту царквы, а таксама пераход ад аграрнага да індустрыяльнага грамадства прывялі да размывання маральнага канону. З’яўленне руху суфражыстак і яго лагічнага працягу – фемінізму на мяжы XIX і XX стст. прывяло да таго, што масы жанчын адчулі сябе роў-

*семейно-брачных установок сельской женщины Беларуси в XX в. (1900–1991 гг.)*, “Научные труды Республиканского института высшей школы”. Серия “Исторические и психолого-педагогические науки”, 2011, вып. 11, ч. 1, с. 111–117; Н. Е. Мусина, *Государственная политика и молодежь: проблемы быта, досуга, отношения полов (БССР, 20-е гг. XX в.)* [w:] *Актуальные проблемы из исторического прошлого и современности в общественно-гуманитарных и социо-религиоведческих науках Беларуси ближнего и дальнего зарубежья: материалы Междунар. научно-теоретической конференции*, red.: В. А. Космач, Витебск, 2007, ч. 2, с. 307−310; Н.Е. Мусина, *Девиантное поведение молодежи Беларуси в 1920-е годы*, [w:] *Достижения фундаментальной, клинической медицины и фармации: материалы 64-й юбилейной науч. сессии сотрудников ун-та, посвященной 75-летию его образования*, red.: В. П. Дейкало, Витебск 2009, с. 603−606; Н. Е. Мусина, *Проблемы быта и семейно-брачных отношений в государственной молодежной политике БССР в 20-е гг. XX в.*, [w:] *Достижения фундаментальной, клинической медицины и фармации: материалы 61-й науч. сессии ВГМУ*, red.: А. П. Солодков, Витебск 2006, с. 547−550; Д. Н. Понуждаев, *Милиция Беларуси в борьбе с проституцией в период новой экономической политики*, “Вестник Воронежского института МВД России”, 2013, № 3, с. 214–218; І. В. Романенко, *Трансформация статуса белорусской сельской женщины в XX – начале XXI в.*, Минск 2015, 201 с.; А. П. Соловьянов, *Проституция несовершеннолетних в Советской Белоруссии в 1920-е годы*, [w:] *Женщина. Общество.*

нымі мужчынам, што кардынальным чынам адбілася на сэксуальных зносінах.

Сацыялісты ўключылі вырашэнне гендэрных праблем у сваю праграму, прычым адразу ж абвясцілі сацыялізм адзіным вучэннем, якое здольна іх канчаткова вырашыць. Яны тлумачылі, што ўсе праблемы ўзаемаадносін паміж паламі выкліка637 заняволеннем жанчыны, а таксама раздзяленнем працы і прыватнай уласнаснасцю. З-за адсутнасці сродкаў да існавання жанчыны ў капіталістычным грамадстве ў якасці прастытутак, утрыманак альбо жонак вымушаны прапаноўваць сябе мужчынам. Прычым, буржуазная мараль прымушае жанчын хлусіць пра каханне нават тады, калі яны кіруюцца халодным разлікам. Адпаведна марксісцкаму вучэнню, жанчыны трывалі двайны прыгнёт – ад капітала і буржуазнай сям'і. Пралетарская рэвалюцыя мусіла знішчыць прыватную ўласнасць, а разам з ёю і сям'ю.

Ужо першыя сацыялісты даволі хутка зразумелі, што сям'я будучыні не можа быць саюзам індывідуальнасцяў. Арыентацыя традыцыйнай сям'і на падтрымку волі індывіда ад пачатку супярэчыла інтарэсам калектыва і класа. Таму сацыял-рэфарматары кшталту Б.П. Анфантэна ўжо ў першай палове XIX ст. паставілі на мэце пераўтварыць сэксуальна-сямейнае партнёрства ў вольнае каханне-сяброўства. Іх тэорыі і практычныя эксперыменты ў камунах

---

*Образование. Материалы 9-ой международной междисциплинарной научно-практической конференции*, Минск 2007, с. 212–215; А. Усманова, *О марксистской теории любви*, "Топос", 2010, № 3, с. 195–227; С. М. Ходзін, *Гендэрны аспект савецкай мадэлі мадэрнізацыі беларускай вёскі (1920-я гады)*, "Гісторыя і грамадазнаўства", 2016, № 5, с. 3–11; И. Р. Чикалова, *Гендерная система (пост) советской Беларуси: воспроизводство и трансформация социальных ролей в публичной и приватной сфере*, "Российские и славянские исследования", 2009, вып. 4, с. 51–66; П. В. Шевелев, *Брачные узы по-новому*, "Беларуская думка", 2014, № 1, с. 95–97; Г. Н. Яковлева, *Общественное и частное в жизни женщин г. Витебска (начало 20-х гг. XX в.)*, [w:] *Женщина. Образование. Демократия. Мат-лы 3-й международной междисциплинарной научно-практической конференции*, red.: Г. И. Шатон, Минск 2001, с. 282–283.

паўплывалі на тое, як сямейна-шлюбныя адносіны разумелі заснавальнікі марксізму.

Ужо ў “Камуністычным маніфесце”, які з’явіўся ў 1848 г. стваральнікі камуністычнай тэорыі, якія, як вядома, не былі панылымі ханжамі, палемізуюць з крытыкамі сацыялізацыі жонак. “Зрэштай, няма нічога сьмяшнейшага, як высока-моральнае абурэньне нашых буржуёў процiў нібыта афіцыяльнай супольнасьці жанок пры комуністычным ладзе. Тымчасам, комуністым няма патрэбы заводзіць супольнасьць жанок, бо гэтая супольнасьць была бадай што заўсёды”. Наступны пасаж класікаў крыху прыадчыняе завесу над таямніцай адносінаў палоў пры камунізме: “У рэчавістасьці буржуазнае малажонства (шлюб) зьяўляецца супольнасьцю жанок. Комуністых можна было б упікнуць хіба ў тым, што яны хочуць паставіць адкрытую супольнасьць жанок на месца брыдкай, патаемнай”.[9] Акрамя абмеркавання вяртання да палігамных адносінаў пры камунізме, К. Маркс і Ф. Энгельс на адной са старонак свайго праграмнага дакумента паведамляюць пра намер камуністаў замяніць хатняе выхаванне дзяцей грамадскім. Пазней, у 1884 г. Ф. Энгельс вярнуўся да абмеркавання адносінаў паміж паламі ў камуністычным грамадстве ў сваёй працы “Паходжанне сям’і, прыватнай уласнасці і дзяржавы”, дзе выступіў ужо за манагамны саюз, заснаваны на вольным каханні і легкі развод у выпадку, калі яно сышло.[10]

Тэму вольнага кахання ў камуністычным грамадстве ў 1879 г. у сваёй працы “Жанчына і сацыялізм” развіў вядомы барацьбіт за правы жанчын, германскі сацыял-дэмакрат А. Бебель. Ён, у прыватнасці, лічыў, што “задавальненне палавой патрэбнасці – такая ж асабістая справа кожнага чалавека, як задавальненне усякай іншай натуральнай патрэбнасці. Ніхто не павінен аддаваць у гэтым спра-

[9] К. Маркс, Ф. Энгельс, *Комуністычны маніфэст*, Менск 1924, с. 41.

[10] Ф. Энгельс, *Паходжанне сям’і, прыватнай уласнасці і дзяржавы*, Мінск 1970, с. 119.

вaздaчу іншaму і не пaклікaны сюды ўмешвaццa.”[11] Акрaмя тaгo, А. Бaбель рaзвіў мaрксісцкую думку прa рaзбурэнне трaдыцыйнaй сям’і шляхaм сaцыялізaцыі дзяцей, a менaвітa прa іх грaмaдскaе выхaвaнне з ясельнaгa ўзрoсту супoльнымі кaмітэтaмі, куды пaвінны ўвaхoдзіць бaцькі і педaгoгі.

Бaльшaвікі не мелі дaклaднaй прaгрaмы ў гaліне сэксуaльнaй і сямейнa-шлюбнaй пaлітыкі. Іх рытoрыкa нa гэты кoнт звoдзілaся перaвaжнa дa сaцыяльнa-экaнaмічнaгa вызвaлення жaнчыны і перaaдoлення гендэрнaй няроўнaсці. Меркaвaлaся, штo нa месцa трaдыцыйнaй сям’і пaвінны былі прыйсці квaзісямейныя фoрмы aргaнізaцыі людзей, звязaныя не крoўнaй еднaсцю, aле вытвoрчымі aбaвязкaмі. У.І. Ленін, як і ягo пaпярэднікі рaзумеў “буржуaзную” сям’ю як перaшкoду нa шляху рэaлізaцыі сaцыялістычнaгa эксперыментa. У тoй жa чaс Ленін зрaзумеў, штo ў сэксуaльнaй свaбoдзе хaвaеццa небяспекa індывідуaлізму. Тaк, у 1915 г. ён рэзкa рaскрытыкaвaў плaн aртыкулa І.Ф. Армaнд, прысвечaнaгa сям’і, жaнoчaму пытaнню і свaбoдзе кaхaння: “Пaтрaбaвaнне свaбoды кaхaння рaю зусім выкінуць, гэтa не прaлетaрскaе, a буржуaзнaе пaтрaбaвaнне”.[12]

Кaлі рэвaлюцыя рaзбурылa трaдыцыйныя нoрмы і рэгулятaры сэксуaльных пaвoдзінaў – цaркву, шлюб і нaвaт сaмo пaняцце кaхaння, зaмяніць іх не былo чым. У 1920 г. у рaзмoве з К. Цэткін, У.І. Ленін высунуў цьмяную думку прa тoе, штo сэксуaльнaй рэвaлюцыі пaпярэнічaе рэвaлюцыя сaцыяльнaя: “У гaліне шлюбу і пaлaвых знoсінaў нaбліжaеццa рэвaлюцыя, сугучнaя прaлетaрскaй рэвaлюцыі”. Рaзaм з тым, пaвoдле ўспaмінaў нямецкaй кaмуністкі, ён не ўхвaляў прaзмерныя зaхaпленні тэoрыяй пoлу, увaгі дa пaлaвых aднoсінaў, зaклікaў мoлaдзь зaймaццa фізычнымі прaктыкaвaннямі зaмест сэксa. У тoй жa рaзмoве з К. Цэткін, Ленін нaзвaў шкoднaй думку aб тым, штo пры сaцыялізме зaдaвoліць пaлaвую смaгу будзе гэтaк жa прoстa як выпіць шклянку вaды.[13]

[11] А. Бебель, *Женщина и социализм*, Петроград 1918, с. 442.
[12] В. И. Ленин, *Полное собрание сочинений*, Москва 1964, т. 49, с. 51.
[13] К. Цеткин, *Воспоминания о Ленине*, Москва 1925, с. 15.

Буйнейшым спецыялістам у галіне гендэрных адносінаў у рускай сацыял-дэмакратыі была А.М. Калантай, погляды якой уяўлялі складаны сімбіёз фемінізму і марксізму. Яна лічыла, што толькі вольныя і, як правіла, шматлікія сэксуальныя сувязі дазволяць жанчыне захаваць уласную індывідуальнасць у грамадстве, дзе гаспадараць мужчыны. Першую сур'ёзную тэарэтычную працу на гэтую тэму пад назвай “Сацыяльныя асновы жаночага пытання” яна напісала ў 1909 г. Сярод вялікага фактычнага матэрыялу, які характарызаваў працу і быт жачын у Расійскай імперыі, мы знаходзім у гэтай працы пакуль што яшчэ вельмі няпэўныя контуры новых сэксуальных адносінаў пры сацыялізме: “Пасля пераносу выхавальніцкай функцыі з сям'і на грамадства знікне апошняе замацаванне сучаснай закрытай сямейнай ячэйкі… На змену сучаснай прымусовай форме шлюбу ідзе вольны саюз свабодных індывідуўмаў… Ідэал вольнага кахання несумненна адпавядае той норме зносінаў паміж паламі, якое ўсталюе калектывісцкае грамадства”.[14] У рэчышчы крытыкі “буржуазнай сям'і” і “буржуазнай падвойнай маралі” А. М. Калантай выказвае ўпэўненасць, што ў недалёкай будучыні “палавая маральнасць зробіцца справай асабістага сумлення кожнага”.[15]

У разгар грамадзянскай вайны А. М. Калантай піша брашуру “Новая мараль і рабочы клас”, дзе развівае свае погляды на каханне і сэксуальныя адносіны ў новым грамадстве. Гэтая брашура была напісана пад уплывам папулярнай кнігі нямецкай феміністкі Г. Мейзель-Хес “Сэксуальны крызіс” (1911), дзе сцвярджалася, што сучасная палавая мараль – фікцыя, а традыцыйны шлюб супярэчыць прыродзе чалавека і забівае каханне. Напачатку Калантай малюе партрэт жанчыны будучага, сканцэнтраванай на працы, але разам з тым не варожай да “зямных радасцяў”. Гэтыя жанчыны – не ўласніцы. Паважаючы пачуцці іншых, яны чула ставяцца да жан-

---

[14] А. Коллонтай, *Социальные основы женского вопроса*, Санкт-Петербург 1909, с. 219.

[15] А. Коллонтай, *Социальные основы*, с. 171.

чын-саперніц і патрабавальна да мужчын, даруючы ім здраду, але не ігнараванне іх духоўнага пачатку.

А.М. Калантай выступае супраць трох асноўных форм сэксуальных адносінаў: легальнага шлюбу, які, на яе думку, супярэчыць мабільнай чалавечай псіхіцы, вольнага саюзу, што вымагае зашмат выдаткаў часу і духоўных сіл, а таксама прастытуцыі. Замест гэтых старых форм, яна прапануе там, дзе адсутнічае вялікае каханне (а яно, як вядома, адсутнічае ў абсалютнай большасці людзей) практыкаваць "каханне-гульню" альбо "эратычнае сяброўства". Гэтую форму сэксуальных адносінаў уяўлялася як "назапашванне любоўнай патэнцыі", "школа кахання", якая не замінае грамадскаму і асабістаму жыццю партнёраў.[16] Ідэал Калантай – гэта манагамны саюз, заснаваны на "вялікім каханні". Але "не бессменны" і не застылы. Чым складаней псіхіка чалавека, тым непазбежней "змены". Таму, на яе думку найбольш распаўсюджанай формай палавых адносінаў пры сацыялізме будзе "канкубінат" альбо "паслядоўная манагамія". Побач з гэтай формай будзе існаваць цэлая гама разнастайных відаў адносінаў у межах "эратычнага сяброўства".[17]

У 1920 г., пасля смерці І.Ф. Арманд, А.М. Калантай на непрацяглы час заняла пасаду загадчыцы жаночага аддзела ЦК УсеКП(б). Такім чынам, яна атрымала магчымасць не толькі прапагандаваць свае радыкальныя марксісцка-феміністычныя погляды праз друк і лекцыі, але ўкараняць іх у жыццё адміністрацыйнымі метадамі. Пра эвалюцыю гэтых поглядаў сведчыць апошняя праца Калантай на тэму сэксуальнай маралі "Дарогу крылатаму Эрасу!"[18], адрасаваная паводле яе падзагалоўку, працоўнай моладзі. У гэтай працы яна паспрабавала пераадолець надта абагуленыя ўяўленні расійскіх

[16] А. Коллонтай, *Новая мораль и рабочий класс*, Москва 1919, с. 43.

[17] А. Коллонтай, *Новая мораль*, с. 46.

[18] Гэты артыкул быў напісаны А.М. Калантай у Нарвегіі, неўзабавае пасля заканчэння бурлівага кахання і трагічнага растання з маладым матросам-балтыйцам П.Я. Дыбенкам, адносіны з якім ставілі пад сумненне практычную значнасць яе тэарэтычных пошукаў.

марксісітаў пра новыя адносіны палоў пры сацыялізме, асэнсаваўшы, што рэвалюцыя – гэта толькі іх выходныя кропка.

Гутарка ў ёй ідзе пра неабходнасць змены ментальнасці людзей і як вынік гэтага – пабудовы новых адносінаў паміж мужчынам і жанчынай у выглядзе разнастайных любоўных саюзаў вольных і раўнапраўных членаў працоўнага калектыва. У прыватнасці, яна піша: "Каханне стала шматгранным, шматструнным… Усё цяжэй пры такой складанасці адценняў кахання усталяваць непасрэдную сувязь паміж "Эрасам бяскрылым" (цялеснай цягай) і "Эрасам крылатым" (цялеснай цягай змяшанай з душэўнымі эмоцыямі)".[19] Далей Калантай наступным чынам развівае ўласную думку пра шматграннасць кахання: "Аднаго жанчына кахае вярхамі душы, з ім сугучны яе думкі, імкненні, жаданні; да другога яе цягне цялесная моц. У адносінах да адной жанчыны мужчына саспытвае пачуцце ашчаднай пяшчоты, у іншай ён знаходзіць падтрымку і разуменне ўласнага я. Якой жа з дзвюх ён павінен аддаць паўнату Эраса? і чаму ён павінен ірваць, нявечыць сваю душу, калі паўнату быцця дае толькі наяўнасць першай і другой духоўнай повязі?". Такім чынам, на яе думку, "ключ да вырашэння праблемы загадкавага кахання да дзвюх і да трох, якая была не па зубах прадстаўнікам буржуазнага грамадства, цяпер апынулася ў руках пралетарыята".[20]

Папярэджваючы моладзь ад захаплення выключна "бяскрылым Эрасам", аўтарка ў той жа час тлумачыла ёй: "Мараль рабочага класа… адкідае знешнюю форму любоўных адносінаў палоў. Для класавых задач рабочага класа зусім абыякава – ці набывае каханне форму працяглага і аформленага саюзу альбо выражаецца ў форме сувязі, якая мінае. Ідэялогія рабочага класа не ставіць аніякіх фармальных межаў для кахання".[21] Падкрэслім, што, паводле Калан-

---

[19] А. Коллонтай, *Дорогу крылатому Эросу! (письмо к трудящейся молодежи)*, "Молодая гвардия", 1923, № 3, с. 120.

[20] А. Коллонтай, *Дорогу крылатому Эросу*, с. 121.

[21] А. Коллонтай, *Дорогу крылатому Эросу*, с. 122.

тай, якая ўпершыню аб’яднала марксізм і сэксуальнасць, падставай для адмовы ад “фармальных межаў” было менавіта *каханне*, а не лёгкія спарванні, сэнс якіх – улада над іншым. Яна выступала супраць буржуазнага вольнага кахання гэтак жа зацята, як і супраць буржуазнага шлюбу. Такім чынам, тэорыя кахання Калантай, збудаваная на марксісцкім сацыяльна-эканамічным падмурку, уключала новыя этычныя катэгорыі і паняцці.

Увасабленню ў сэксуальнх адносінах шчырасці, асабістай незалежнасці і эратычнай радасці былі павінны спадарожнічаць новыя формы агульнажыцця і выхавання дзяцей. У 1920 г. Калантай падтрымала заканадаўчую легалізацыю абортаў у РСФСР (і адпаведна ў БССР), якія лічыла часовай з’явай. Яна выступала за перадачу дзяцей, са згоды маці, на выхаванне ў дзяржаўныя ўстановы, дзеля чаго насельніцтва трэба было абкласці спецыяльным падаткам. Важнай умовай пабудовы новага быту з’яўлялася супольнае пражыванне ў звязаных з вытворчымі калектывамі дамкамунах, дзе вядзенне гаспадаркі ўскладалася на спецыялістак.

Брытанскі гісторык-марксіст Э. Хобсбаўм адзначаў, што яму “…невядомы ніводны рэвалюцыйны рух альбо рэжым, які б не развіваў пурытанскую тэндэнцыю, уключаючы марксісцкі рух, дактрына заснавальнікаў якога была далёка не пурытанская”.[22] Немала прыхільнікаў падобнай пурытанскай тэндэнцыі – апанентаў А.М. Калантай было ў савецкай дзяржаўнай і партыйнай эліце. Сярод апошніх мы знаходзім наркама асветы А.В. Луначарскага, члена Палітбюро ЦК УсеКП(б) М.І. Бухарына, наркама аховы здароўя РСФСР М.А. Сямашку, сакратара Цэнтральнай кантрольнай камісіі УсеКП(б) Е.М. Яраслаўскага, сакратара Выканкама Камінтэрна Д.З. Мануільскага, загадчыка жанаддзела ЦК УсеКП(б) С.М. Смідовіч і інш. Усе яны, адкрыта альбо схавана палемізуючы з А.М. Калантай, выступалі супраць нястрыманасці ў зносінах паміж паламі, тлумачучы сваю пазіцыю тым, што неперабарлівасць у сэксе ўласціва буржуазнаму

[22] E. Hobsbawm, *Revolutionaries*, London 2011, p. 252.

грамадству, яна вядзе да шкодных грамадскіх наступстваў і да т. п. Разам з тым, усе яны будавалі ўласныя развагі па праблемах выхавання палавой маралі вакол тэорыі новага кахання А.М. Калантай, якая набыла вялікую папулярнасць у грамадстве, асабліва – сярод моладзі.

Так, Д.З. Мануільскі, не прапануючы ніякіх новых мадэляў сэксуальных паводзінаў, заклікаў моладзь звярнуцца да аскетычнай маралі старых бальшавікоў-падпольшчыкаў, а таксама больш вучыцца, чытаць, працаваць. Е.М. Яраслаўскі разглядаў развагі пра крылаты і бяскрылы Эрас у адным шэрагу з буржуазнымі тэорыямі кахання.

У маі 1925 г. чытачы гомельскай "Палесскай праўды" маглі азнаёміцца з артыкулам М.І. Бухарына, прысвечаным упарадкаванню быту моладзі. Абмеркаванне праблемы на падобным высокім узроўні сведчыла пра яе сур'ёзны характар. Бухарын заклікаў савецкую моладзь спыніць сэксуальную рэвалюцыю, тлумачыўшы ёй, што ад баявой, разбуральнай працы дзяржава перайшла да мірнага будаўніцтва. Ён, у прыватнасці, засцерагаў маладых чытачоў: "Чулі, напрыклад, некаторыя нашы юнакі і дзяўчаты, што вельмі рэвалюцыйным лічылася пляваць на ўсялякія сарамлівасці ў галіне палавых адносінаў. Тады гэта быў рэзкі пратэст супраць сляпых забабонаў грамадства, супраць агідных законаў так званага сямейнага права, супраць прыніжэння жанчыны. Але людзе не разумеюць гэтага і па-ранейшаму лічуць, што максімум неўрэгуляванасці – самы святы закон".[23]

У 1926 г. рэдакцыя віцебскай "Зары Захаду" змясціла вытрымку з лекцыі А.В. Луначарскага "Якім будзе сацыялістычны быт". З яе вынікала, што шлюб пры сацыялізме павінен быць парным, дзяцей павінны выхоўваць іх бацькі. Наркам асветы, пагаджаючыся з Калантай у пытанні аб неабходнасці вызвалення жанчын ад быту

---

[23] Н. Бухарин, *Об упорядочении быта молодежи*, "Полесская правда", 1925, № 122, с. 2.

і ўцягненні іх у будаўніцтва сацыялізму, палемізаваў з ёй адносна вольных адносін паміж паламі і ўвядзення 5-рублёвага падатку на калектыўнае выхаванне дзяцей.[24] У наступныя гады пазіцыя Луначарскага ў палавым пытанні стала яшчэ больш кансерватыўнай. Ён прапанаваў глядзець на асобу, якая мае 5-6 разводаў, як на злодзея, што мае за плячыма 5-6 крадзежоў са ўзломам. Гэтыя думкі, выкладзеныя ў спецыяльнай брашуры, прысвечанай пытанням быту,[25] Луначарскі агучыў на сваёй публічнай лекцыі ў Мінску 18 лістапада 1928 г. У прыватнасці, народны камісар асветы заклікаў адмовіцца ад погляду на жанчыну як на прадмет асалоды, а таксама супраць тых "новых" адносінаў, якімі "хванабэряцца многія маладыя шчалкапёры". "Які ж рэцэпт мы можам даць моладзі ў адказ на яе пытанне аб тым, як ёй наладзіць свае палавое жыццё?" – рытарычна пытаў А.В. Луначарскі сваю аўдыторыю. і адразу ж даваў адназначны адказ: "Устрыманне. Устрыманне для моладзі зусім не шкодна".[26]

Але галоўным апанентам А.М. Калантай стаў псіханеўролаг-марксіст А.Б. Залкінд, які ў сярэдзіне 1920-х гг. у шэрагу артыкулаў паспрабаваў сфармуляваць новую савецкую мадэль сэксуальных паводзінаў моладзі. Адпаведна ёй, клас пралетарыяў у мэтах рэвалюцыйнай мэтазгоднасці меў права ўмешвацца ў палавое жыццё яго асобных прадстаўнікоў. Палавое прыцягненне пралетарыя да тых, хто паходзіў з эксплуататарскіх класаў, Залкінд прапанаваў разглядаць у якасці аднаго з відаў палавых вычварэнняў, як прыцягненне "да кракадыла, да арангутанга". У адносінах паміж мужчынам і жанчынай не павінна было быць флірта, заляцанняў, какецтва і іншых формаў "палавога заваявання". Сэксуальная прыцягальнасць чалавека вызначаецца яго класавай прыналежнасцю.

---

[24] *Полесская правда*, 1926, № 286, с. 3.
[25] А. Луначарский, *О быте*, Москва–Ленинград 1927, 83 с.
[26] *Зьвязда*, 1928, № 267, с. 4.

У 1924 г. выйшла папулярная праца А.Б. Залкінда з шакуючай назвай “Дванаццаць палавых запаведзяў рэвалюцыйнага пралетарыята”, які выклікала абмеркаванні, спрэчкі, водгукі ў друку. Яе пафас быў накіраваны на ўпардкаванне сэксуальнага жыцця савецкіх мужчын і жанчын на аснове класавай, пралетарскай этыкі. У рэчышчы фрэйдысцкай тэорыі сублімацыі, псіханеўролаг-марксіст прапанаваў маладым будаўнікам сацыялізму не спяшацца брацца шлюбам, устрымліваццa ад выпадковых сувязяў, эканоміць сэксуальную энергію для грамадска-карысных спраў, шукаць сэксуальных партнёраў па класавай прыкмеце, пазбавіцца ад рэўнасці і, нарэшце, дазволіць класу карэкціраваць палавое жыццё сваіх індывідаў.[27]

Характарызуючы розныя погляды прыхільнікаў пурытанскага спосаба вырашэння палавога пытання, трэба адзначыць, што ўсіх іх аб’ядноўваў агульны погляд на сэкс, як на нешта другаснае, на тое, што пасля пабудовы базіса сацыялізму вырашыцца само сабою. Аднак, толькі асуджэнне апалагетыкі сэксуальнай разняволенасці не давала адказаў на важныя жыццёвыя пытанні, якія абмяркоўваліся на шматлікіх камсамольска-маладзёжных сходах. Напрыклад, як ставіцца да кахання паміж мужчынам і жанчынай па-за межамі новага грамадзянскага шлюбу?

## Тэарэтычныя пошукі ў Савецкай Беларусі

Адным з найбольш дасведчаных спецыялістаў у БССР у галіне марксісцкага вырашэння “жаночага пытання” была жонка старшыні СНК БССР Я.А. Адамовіча – С.С. Шамардзіна. Яна ўзначальвала жаночы аддзел ЦК КП(б)Б у час, калі пасаду загадчыка аналагічнай структуры ў ЦК УсеКП(б) у Маскве займала А.М. Калантай. Як і яе старэйшая і па пасадзе і па ўзросце калега Шамардзіна была гарачай прыхільніцай бытавога равенства, грамадзянскага шлюбу,

[27] А. Б. Залкинд, *Двенадцать половых заповедей революционного пролетариата* [w:] *Философия любви*, Москва 1990, т. 2, с. 224–255.

лёгкіх разводаў, а таксма абортаў. У сваіх шматлікіх выступах таго часу яна канструіруе вобраз "новай жанчыны", вольнай ад маральных абмежаванняў і старой маралі. Гэтая "новая жанчына" сваёй галоўнай справай лічыць служэнне грамадству, а таксама самаўдасканальванне, у т. л. у галіне адносінаў з процілеглым полам. Адвечныя сацыяльныя ролі жонкі і маці для яе з'яўляюцца другаснымі.

Напрыклад, 5 кастрычніка 1921 г. выступаючы на дэлегацкім сходзе работніц г. Мінска з дакладам "Аб шлюбна-палавой маралі", Шамардзіна тлумачыла жаночым актывісткам: "Цяпер, падчас пераходнага перыяду адбываецца ломка старой сям'і. Жанчыны ўжо маюць роўныя правы. Эканамічная залежнасць жанчыны ад мужчыны адпадае. Выхаванне дзяцей робіцца грамадскім. Цяпер цяжка вызначыць якія формы набудуць сямейна-шлюбныя адносіны, але дваістасці маралі буржуазнай сям'і больш не будзе. Мужчына і жанчына будуць адрозніваццa толькі паламі".[28] Падобную рыторыку, накіраваную на разбурэнне традыцыйнай сям'і мы знаходзім у выступах заступніц С.С. Шамардзінoй на пасадзе загадчыка жанаддзела. Так, М.Ф. Муратава, выступаючы 2 мая 1923 г. на сходзе дэлегатак з дакладам "Аб новых формах быту работніц" прама заявіла: "Жанчына павінна вызваліцца ад цяжара сямейнага жыцця. Неабходна ўцягнуць у жанаддзел жонак рабочых, якія дапамогуць разбурыць стары быт, сям'ю рабочага".[29]

Новыя ідэі, накіраваныя на разбурэнне традыцыйнай сям'і актыўна абмяркоўваліся на старонках тагачаснага савецкага друку, у т. л. беларускага. Галоўная газета рэспублікі "Звязда" змяшчала артыкулы ў падтрымку жанчын, якія наўважыліся кінуць выклік старой маралі і пакінуць нялюбага мужа насустрач новаму, вольнаму каханню.[30] Абмяркоўваліся на старонках "Звязды" таксама

---

[28] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь [dalej: НАРБ], ф. 4п, воп. 1, спр. 603, Праткoлы дэлегацкіх сходаў, арк. 150.

[29] НАРБ, ф. 4п, воп. 1, спр. 1195, Пратаколы дэлегацкіх сходаў, арк 59.

[30] Гл. напр.: Правдин, *Женщина, которая осмелилась…*, "Звезда", 1927, № 91, с. 2.

практычныя пытанні ўладкавання новага быту. Напрыклад, напрыканцы 1925 г. газета змясціла артыкул жаночай актывісткі Ц. Камінскай у падтрымку ідэі А.М. Калантай аб неабходнасці ўвядзення невялікага падатку на халастых і бяздзетных, які пойдзе на калектыўнае выхаванне дзяцей.[31]

Прыхільнікам новых, вольных адносінаў паміж паламі давалі слова таксама рэдактары беларускіх рэгіянальных газет. У 1923 г. гомельскі спецыяліст па ахове мацярынства і маленства Г. Серман у спецыяльным артыкуле, прысвечаным барацьбе за падобныя адносіны пісаў: “Можа быць гэтыя новыя формы сям’і ўжо знойдзены. Можна меркаваць, што арганізацыя грамадскага харчавання, дзяржаўнага выхавання дзяцей адыграе пэўную разбуральную ролю. Нам трэба падобныя з’явы ўзмацняць і паглыбляць. і гэтую ролю павінны ўзяць на сябе Саветы”.[32] У тым жа годзе карэспандэнт газеты “Палеская праўда” выступіў з рэзкай крытыкай класічных і эстрадных танцаў. Крытыкаваў ён танцы з зусім нечаканага боку, а менавіта як пошлую, мяшчанскую прэлюдыю да кахання. На яго думку, новая савецкая моладзь, у адрозненні ад мяшчанскай не была павінна “…хаваць свае каханне, свае здаровае імкненне адзін да аднаго ад цэлай арміі глупых і дробных забабонаў”.[33]

У 1925 г. рэдакцыя віцебскай газеты “Зара Захаду” паведаміла чытачам пра гурток быту, які дзейнічаў пры ёй. На яго паседжаннях абмяркоўваліся пераважна пытанні барацьбы са спадчынай мінулага ў выглядзе ненармальных адносін паміж мужчынамі і жанчынамі – прастытуцыі, абортаў, венерычных захворванняў, палавых вычварэнняў. Разам з тым, сябры гуртка быту не маглі ўстрымацца ад таго, каб зазірнуць у будучыню. Так, на паседжанні гуртка 8 лю-

---

[31] Ц. Каминская, *О ликвидации дел “алиментных”*, “Звезда”, 1925, № 291, с. 3.

[32] Серман, *Советы и борьба за быт*, “Полесская правда”, 1923, № 1061, с. 2.

[33] А. Иркутов, *Где мы теряем время и силы*, “Полесская правда”, 1923, № 946, с. 3.

тага 1925 г. было вырашана ўвесці "…прастату, нармальную, натуральную неабходнасць у палавыя зносіны… якія працягваюць заставацца сакрэтна-забароненым, таямнічым, пра што гавораць шэптам, чаго дамагаюцца хітрыкамі".[34] У студзені 1925 г. сябры гуртка ў поўным складзе наведалі лекцыю-дыспут "Як і навошта мы бярэмся шлюбам", што адбылася ў Віцебскім гарадскім тэатры.[35] У снежні таго ж году Віцебскі тэатр не змог умясціць усіх жадаючых праслухаць лекцыю "Палавое рабства", прачытаную вядомым дзеячам расійскага рэвалюцыйнага руху У.А. Пасэ, падчас якой ён "сакавіта і вобразна" распавядаў пра паэтыку палавога акта.[36]

Дыскусія аб узаемаадносінах палоў у сацыялістычным грамадстве выходзіла на вышэйшую партыйную трыбуну рэспублікі. Так, на адным з паседжанняў X з'езда КП(б)Б, якое адбылося 8 студзеня 1927 г. прыбылы з Масквы начальнік Усходняга аддзела АДПУ, па сумяшчальніцтву член Камісіі партыйнага кантролю пры ЦК УсеКП(б)Б Я.Х. Петэрс ухіліўся ад прамога адказу на пытанне аб стандартах сэксуальных паводзінаў камуністаў. Прадстаўнік "партыйнай інквізіцыі", праз рукі якога прайшлі сотні спраў членаў УсеКП(б), якія адмовіліся ад уласных жонак і дзяцей, сказаў, што яму цяжка высвятліць дакладна характар адносінаў жанатых камуністаў з іншымі жанчынамі і як гэтыя адносіны стасуюцца са знаходжаннем у партыі. і дадаў: "Жыццё у нас надзвычай ненармальнае. Я не ведаю як камуністы будуць жыць пры камунізме".[37]

Новую тэарэтычную складаючую у дыскусію аб адносінах палоў пры сацыялізме прапанавала маладая беларуская сацыялогія. Прафесар БДУ С.Я. Вальфсон, прысвяціў гэтаму пытанню асобную манаграфію пад назвай "Сацыялогія шлюбу і сям'і". Пачынаючы

---

[34] Ф. Круглов, *Почему мы ставим половой вопрос*, "Заря Запада", 1925, № 31, с. 3.

[35] Круглов, *Лекция-диспут Жернова*, "Заря Запада", 1925, № 10, с. 5.

[36] *Заря Запада*, 1925, № 274, с. 3.

[37] НАРБ, ф. 4п, воп. 1, спр. 3083, Стэнаграма паседжанняў X з'езда КП(б)Б, арк. 452.

з 1926 г. 32-гадовы сацыёлаг змяшчаў фрагменты з яе ў перыядычным друку. Ужо ў першай падобнай публікацыі ён праводзіць думку пра ўмоўнасць, часовы характар маральных нормаў у чалавечым грамадстве, пачынаючы ад сораму дэманстраваць уласнае аголенае цела і сканчаючы сорамам імкнення да палігамных сэксуальных зносінаў. На яго думку, у адрозненні ад жывёл, якія спрадвеку падзяляліся і будуць падзяляцца на манагамных і палігамных, чалавечае грамадства "…не знае адвечных і якія раз на заўсёды вызначаюцца маральных прынцыпаў…Сягоньня маральны прынцып – моногамія, учора і пазаўчора – полігамія, поліандрыя, дзесяткі іншых шлюбных форм, якія асьвечвала для свое эпохі сучасная мараль… пад ціскам экономічнай патрэбы".[38]

У другой публікацыі, прысвечанай такой форме палавой забароны, як экзагамія Вальфсон моцна крытыкуе З. Фрэйда за яго спробы вытлумачыць сэксуальныя паводзіны людзей з дапамогаю "механістычных заалагічных упадабленняў". Прычым робіць ён гэта з дапамогаю цытаты з працы Ф. Энгельса "Паходжанне сям'і, уласнасці і дзяржавы"[39], якая дапамагла аўтару зразумець вытокі поглядаў бальшавікоў на сэксуальна-шлюбную сферу: "Узаемная ж цярпімасць дарослыў самцоў, адсутнасць рэўнасці была першаю ўмоваю для ўтварэння такіх буйных і моцных груп, у асяроддзі якіх толькі і магло адбыцца пераўтварэнне жывёлы ў чалавека".[40]

У 1929 г. у выдавецтве БДУ выйшла "Сацыялогія шлюбу і сям'і", у якой С. Я. Вальфсон аб'яднаў усе свае папярэднія напрацоўкі па

---

[38] С. Вольфсон, *Лёс чалавечай маралі,* "Полымя", 1926, № 6, с. 59–73; № 7, с. 65–81.

[39] Ва ўводзінах да сваёй кнігі "Сям'я і шлюб у іх гістарычным развіцці", якая выйшла ў знакавым 1937 г. С.Я. Вальфсон быў вымушаны прабачацца за "…рад няправільных сцвярджэнняў і памылковых установак па пытаннях, звязаных з развіццём сям'і", у т. л. за інтэрпрэтацыю думак Ф. Энгельса, здзейсненую ў сярэдзіне 1920-х гг. С. Я. Вальфсон, *Сям'я і шлюб у іх гістарычным развіцці*, Менск 1937, с. 4.

[40] С. Я. Вольфсон, *Экзогамия*, "Працы Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту ў Менску", 1928, № 20, с. 13.

вызначаным пытанні. Коратка галоўную думку гэтай кнігі можна выкласці наступным чынам. Падзенне капіталізму прывядзе да трансфармацыі сям'і. Пабудова сацыялізму нясе з сабою адміранне сям'і і сацыялізацыю выхавання дзяцей. Пасля пабудовы сацыялістычнага грамадства дэзынтэграцыя сям'і дасягне свайго поўнага завяршэння. Кажучы пра правядзенне сэксуальнай рэвалюцыі на Беларусі, дзе ў той час сяляне ўтваралі больш за 80% насельніцтва, Вальфсон с задавальненнем адзначае, што "…пасля рэвалюцыі пазашлюбная палавая сувязь зрабілася ў вёсцы даволі звычайнай з'явай, …нарадзіўшая ў дзявоцтве – не закляймёная, як гэта было раней, …развод стаў у савецкай вёсцы звычайна з'явай".[41] Свае словы пра крызіс сямейных адносінаў ("развесціся ў нас у пэўных выпадках лягчэй, чым адзначыцца выбыўшым у дамовай кнізе") ён ілюструе наступнымі лічбамі: з 1924 па 1927 гг. колькасць шлюбаў на 100 тыс. насельніцтва ў БССР скарацілася з 1 120 да 850, а разводаў – наадварот, павялічылася з 60 да 180.[42]

На старонках кнігі С. Я. Вальфсона мы знаходзім водгукі дыскусіі, што адбывалася па гэтым пытанні па ўсёй краіне на працягу 1920-х гг. Ён уступае ў завочную палеміку з праціўнікамі крайнасцяў сэксуальнай рэвалюцыі. Так, выступаючы супраць вульгарна-матэрыялістычнага звядзення адносінаў паміж паламі да голай фізіялагічнай сувязі, супроць тэорыі стакана вады, ён рэзка крытыкуе "Дванаццаць палавых запаведзяў рэвалюцыйнага пралетарыята" А.Б. Залкінда, якія называе "дабрачынна-пастырскімі пропаведзямі".[43] Аўтар таксама звяртае ўвагу чытача на небяспечную з'яву, што пачала набіраць моц сярод праціўнікаў новай палавой маралі, а менавіта, на ўваскрашэне царкоўнага шлюбу. У заключэнні Вальфсон прызнаецца, што не ведае, якія будуць новыя формы палавых ад-

[41] С. Я. Вольфсон, *Социология брака и семьи (опыт введения в марксистскую генеономию)*, Минск 1929, с. 401.

[42] С. Я. Вольфсон, *Социология брака*, с. 411.

[43] С. Я. Вольфсон, *Социология брака*, с. 382.

носінаў у сацыялістычным грамадстве. На яго думку, можна толькі меркаваць, што ў іх не будзе ні эканамічнага разліку, ні прымусу, яны не будуць абавязкова звязаныя са шлюбам і сям'ёй, для іх будзе неабавязковае сумеснае пражыванне партнёраў. а адзінае праяўленне дзяржаўнага кантролю палавых адносінаў грамадзян сацыялістычнага свету будзе мець еўгенічны характар у выглядзе забароны рэпрадукцыі па медыцынскіх паказчыках.[44]

Не абмяжоўваючыся публікатарскай дзейнасцю, С.Я. Вальфсон прасоўваў ідэі новай маралі ў жывой аўдыторыі. У лютым 1929 г. ён выступіў на камсамольскім дыспуце "Ці патрэбна нам сяброўства?", які адбыўся ў Мінску з удзелам прэзідэнта Беларускай Акадэміі навук У.М. Ігнатоўскага. У сваім уступным слове дакладчык заклікаў зал распрацоўваць новыя формы сяброўства[45], "…падпарадкаваныя клясе і рэвалюцыі".[46] У кастрычніку 1929 г. на запрашэнне рэдакцыі газеты "Чырвоная змена" ён рыхтаваўся да ўдзелу ў дыскусіі "Якой павінна быць камсамольская сям'я". Але, па загаду зверху, яна была спынена так і не распачаўшыся.[47]

Новы погляд на псіхалогию сэксуальнасці прапанаваў беларускаму грамадству вучань С.Я. Вальфсона, з 1923 г. – выкладчык, а з 1929 г. – прафесар БДУ Б.Э. Быхоўскі. На адно з найбольш актуальных пытанняў для савецкіх вучоных 1920-х гг. пра магчымасць сумяшчэння фрэйдызму і марксізму ён даў станоўчы адказ, але з пэўнымі абмежаваннямі. Вывучаючы феномен сям'і, малады беларускі сацыёлаг выкарыстоўваў метад псіхааналізу, які лічыў матэрыя-

---

[44] С. Я. Вольфсон, *Социология брака*, с. 444–449.

[45] Пафас прамовы С.Я. Вальфсона быў сапсаваны наступнай запіскай з залы: "Скажэце, як мне паступіць, як ацаніць такое сяброўства. Я – рабочая дзяўчына сябравала з хлопцам-камсамольцам. Ён быў лепшы мой сябра на працягу некалькіх месяцаў. і што-ж, чым скончылася наша сяброўства? Як толькі ён узяў мяне, – ён больш ня ведаў, не здароваўся, не гутарыў са мной. Я была ім ашукана. Мне стала ясна, што хлопец толькі дамагаўся свайго. Як жа пастуніць з ім, як назваць такое сяброўства".

[46] А. Каліта, *Ці патрэбна нам сяброўства?*, "Чырвоная зьмена", 1929, № 44, с. 4.

[47] *Чырвоная змена*, 1929, № 235, с. 2.

лістычным, маністычным і дыялектычным вучэннем. У 1923 г. ён выступіў у падтрымку тэорыі сублімацыі сэксуальнай энергіі ў сацыяльную дзейнасць, а таксама патлумачыў сэксуальныя неўрозы і фізіялагічную рэгрэсію чалавека прычынамі сацыяльнага характару.[48] Быхоўскі працягваў даследаваць з пазіцый фрэйдызму сацыялогію шлюбу і сям'і, што не перашкаджала яму крытыкаваць бацьку псіхааналізу, напрыклад за біялагізацыю сацыяльных з'яў. Ён, у прыватнасці, пісаў, што "…для нас сэксуальнае заўсёды з'яўляецца сацыяльнай праблемай, яно ўплывае на культуру, трансфармуючыся ў залежнасці ад канкрэтных грамадскіх умоваў… табу і падобныя яму культурныя з'явы – сацыягенныя".[49] У 1926 г. у Мінску выйшла кніга "Метапсіхалогія Фрэйда", у якой першы беларускі фрэйда-марксіст выдзяліў прымальныя і непрымальныя кампаненты (у т. л. прынцыпы працы псіхічнага апарата) вучэння З. Фрэйда, вызначыў перспектывы яго выкарыстання і развіцця ў рамках марксісцкага вучэння. [50]

Але ўпершыню магчымасць публічнага выказвання ўласных поглядаў на будучыню сямейна-шлюбных адносінаў 20-гадовы Быхоўскі атрымаў 7 кастрычніка 1921 г. у Мінску на пасяджэнні ячэйкавых арганізатараў жанаддзелаў. Студэнт БДУ вельмі красамоўна і дасведчана для свайго ўзросту тлумачыў актывісткам жаночага руху: "Палавое каханне – гэта цалкам здаровая і натуральная з'ява і нам камуністам трэба глядзець на яго менавіта так. Гэта – не нізкае, жывёльнае. Сапсаванай трэба называць жанчыну, якая ўстрымалася, але не тую, што здзейсніла палавы акт. Не можа быць ніякіх дэкрэтаў аб каханні. Каханню трэба даць вольнае натуральнае развіццё. Камуністы – не пракокі, мы не ведаем, што з гэтага атрымаецца. Чалавек па натуры шматшлюбны. Гісторыя

[48] Б. Быховский, *О методологических основаниях психоаналитического учения Фрейда*, "Под знаменем марксизма", 1923, № 11–12, с. 158–177.

[49] Б. Быховский, *Генеономические воззрения Фрейда*, "Под знаменем марксизма", 1926, № 9–10, с. 190.

[50] Б. Быховский, *Метапсихология Фрейда*, Минск 1926. 40 с.

нам гэта даказвае. Адна з формаў шматшлюбнасці – гэта асабістае вольнае каханне, як лепшы сродак таварыскай спайкі. Мне могуць запярэчыць, што гэта прастытуцыя. Але мы раз і назаўсёды ўстанавілі, што прастытуцыяй з'яўляецца акт продажы жанчынай ці мужчынам уласнага цела. Рэўнасць асуджана на знікненне пры камуністычным ладзе разам з сям'ёй і шлюбам". Не ўсе з прысутных былі гатовыя пагадзіцца з падобным радыкальным пераглядам традыцыйнай палавой маралі. У пратаколе пасяджэння мы чытаем: "Крэйндзель, Сапун, Меляхавіцкая запярэчылі лектару, што не можа быць шматшлюбнасці, не можа каханне быць заснавана выключна на палавым сужыцельстве".[51]

Можна меркаваць, што тэматыка прац першай паловы 1920-х гг. другога беларускага сацыёлага – С.З. Кацэнбогена была таксама вызначана новай дзяржаўнай сямейна-шлюбнай палітыкай. У іх загадчык кафедры сацыялогіі і першабытнай культуры БДУ, які да таго часу паспеў заняць шэраг вышэйшых пасад у беларускай савецкай выканаўчай уладзе, закрануў найбольш вострыя праблемы генеаноміі – раздзела сацыялогіі, які вывучае развіццё форм шлюбу і сям'і. Да гэтых праблем ён адносіў неўпарадкаваныя палавыя адносіны, групавы шлюб, экзагамію, матрыярхат, а таксама ўзроства-палавыя класы альбо групы. Пра іх Кацэнбоген распавёў 30 кастрычніка 1923 г. у сваёй актавай прамове на ўрачыстым сходзе БДУ, якая выдалі тады ж у выглядзе асобнага артыкула. Не менш увагі прамоўца надаў у сваім выступе завочнай палеміцы з прыхільнікамі тэорыі адвечнасці парнага шлюбу, манагаміі. Адстайваючы погляд на палігамію як на ўніверсальны для ўсіх этнасаў перыяд у іх развіцці, Кацэнбоген разумеў яе як неад'емны складнік першабытнага камунізму. Ён даводзіў, што гэта форма сямейна-шлюбных адносінаў была ўласціва не толькі экзатычным паўднёвым культурам, але таксама старажытным кельтам, германцам і славянам. З гэтага натуральна вынікала непазбежнасць вяр-

[51] НАРБ, ф. 4п, воп. 1, спр. 602, Пратаколы дэлегацкіх сходаў, арк. 81.

тання да палігамных адносінаў чалавечай супольнасці на новым узроўні на камуністычнай стадыі яго развіцця.[52]

Больш разняволенай, чым на ўрачыстым сходзе БДУ, была атмасфера пасяджэння гісторыка-сацыялагічнай секцыі навуковага таварыства пры ўніверсітэце, якое адбылося 11 лютага 1923 г. С.З. Кацэнбоген прапанаваў удзельнікам схода даклад, у якім зрабіў сацыялагічны аналіз "этнаграфічнага рамана" французскага пісьменніка афрыканскага паходжання Р. Марана "Батуала".[53] Даклад выклікаў "жывыя і цікавыя дэбаты", бо Кацэнбогена ў рамане прыцягнула не яго антыкаланіяльная накіраванасць, але "суцэльная свабода палавых адносінаў у адсталых плямёнаў падчас значных гадавых святаў, асабліва падчас свята прысвячэння юнакоў і дзяўчат у сапраўдныя, дарослыя члены племені".[54] Увесь пафас выступлення Кацэнбогена быў накіраваны на падтрымку тэорыі першабытнага грамадства Л.Г. Моргана ("моргана-энгельсаўскай канцэпцыі"), у прыватнасці яго тэзіса аб неўпарадкаваных палавых адносінах, што і даказваў раман Р. Марана. Адначасова малады беларускі сацыёлаг крытыкаваў заходніх вучоных на чале з адным з заснавальнікаў сэксалогіі Э.А. Вестэрмаркам, якія лічылі, што ў першабытным грамадстве існаваў "абасоблены шлюб" (Sonderehe).

Разняволенасці пасяджэння навуковага таварыства пры БДУ 11 лютага 1923 г. паспрыяў падбор цытат з рамана Р. Марана, які прапанаваў дакладчык яго ўдзельнікам. Вось адна з іх, дзе апісваецца абрад ініцыяцыі ў цэнтральнаафрыканскім племені: "Усе

[52] С. З. Каценбген, *Спорные вопросы генеономии*, "Працы Беларускага дзяржаўнага унівэрсытэту", 1923, № 4–5, с. 283–304.

[53] Раман Рэнэ Марана "Батуала" быў першым франкамоўным мастацкім творам, напісаным цёмнаскурым аўтарам. У 1921 г., адразу ж пасля выхаду, атрымаў прэмію прэмію братоў Ганкур, і адначасова трапіў пад моцную крытыку за асуджэнне дзеянняў французскай каланіяльнай адміністрацыі ў Цэнтральнай Афрыцы. У 1923 г. перакладзены на рускую мову.

[54] С. З. Каценбоген, *Первобытный человек. Опыт социологического анализа этнографического романа Ренэ Марана "Батуала"*, Минск 1923, с. 22.

гэтыя крыкі, усе гэтыя бязладныя танцы павінны былі толькі падрыхтаваць тое, што ўсе чакалі: танец кахання, які танчаць толькі ў гэты вечар, калі дазволена аддавацца распусьце і злачынству... На Ясігінджы быў надзеты велічэзны фалус з размаляванага дрэва ... Драўляны фаллус падскокваў пры кожным яе руху ... Мужчыны скінулі кавалкі матэрыі, якія апяразвалі іх сьцёгны, жанчыны скінулі свае пярэстыя фартухі, у каго яны былі. Грудзі – мужчынскія і жаночыя – ударaліся адна аб адну. Дзеці пераймалі рухі дарослых... завязвалася барацьба, чуліся хрыплыя воклічы. Часам целы выцягваліся на зямлі, паўтараючы ўсе рухі танца... Над усімі уладна панавала толькі жаданне”.[55] У другім месцы свайго выступлення С.З. Кацэнбоген прапанаваў погляд на абразанне[56] як на абрад ініцыяцыі хлопчыкаў-падлеткаў “…старажытны і сівы, як само чалавецтва”.[57] Вучоны працягваў даследаваць палігамныя формы адносінаў на канкрэтна-гістарычным матэрыяле ў некаторых іншых працах.

Арыгінальны погляд на ўзаемаадносіны палоў праз прызму маралі прапанаваў у 1926 г. аспірант кафедры фізіялогіі жывёл БДУ Я.Я. Кіпель. Як і многія іншыя вучоныя-прыродазнаўцы, ён быў прыхільнікам натуралістычнага падыходу, які выводзіў чалавечую мараль з законаў прыроды, у прыватнасці біялагічнай эвалюцыі. Знаходзячыся пад уплывам ідэй Г. Спенсэра і Ч. Дарвіна, Кіпель лічыў, што мараль іншымі сродкамі (сацыяльнымі, культурнымі) вырашае тыя ж задачы, якія вырашаюцца з дапамогай біялагічных механізмаў на больш нізкіх прыступках развіцця жыцця. Дапамога слабым і хворым, узаемадапамога, супрацоўніцтва, салідарнасць,

---

[55] С. З. Каценбоген, *Первобытный человек*, с. 26.

[56] Неўзабаве абрад абразання будзе ўзгадвацца ў публічным дыскурсе толькі ў кантэксце судовай медыцыны. Гл: А. Х. Левін, В. Ф. Чэрвакоў, *Абразаньне ў асьвятленьні навуковай экспертызы*, “Працы Беларускага дзяржаўнага інстытуту крыміналёгіі, крыміналістыкі судовай экспэртызы НКЮ БССР”, 1932, вып. II, с. 139–178.

[57] С. З. Каценбоген, *Первобытный человек*, с. 24.

эмпатыя, нарэшце, *каханне* – усе гэтыя рысы сустракаюцца ў свеце жывёл, асабліва ў вышэйшых і "грамадскіх" (г. зн. тых, што жывуць у зграі альбо статку). У рэфераце, абараненым у 1926 г. у БДУ і ў дапрацаваным выглядзе выдадзеным у 1953 г. у Нью-Ёрку Кіпель піша: "Нагляданьні над жыцьцём жывёлінаў паказалі, што сям'я ў стварэньні маральных праяўленьняў ня мае значаньня. Калі ў вароньняй сям'і забіць саміцу, дык самец пакідае дзяцей і адлятае. Значыць, яму патрэбна толькі саміца, але не сям'я".[58] Падобны натуралістычны погляд на каханне дэрамантызаваў яго, пазбаўляў гэтае тонкае пачуцце таямніцы і загадкавасці.

Нягледзячы на шматлікія спасылкі на творы Маркса, рэферат, у якім Я. Кіпель выклаў свае погляды на паходжанне маралі, выклікаў шматлікія спрэчкі спачатку на кафедры фізіялогіі, а потым у парткаме ўніверсітэта. "Доўга мне ўспаміналі гэты рэферат: нават на судзе пракурор цвердзіў, нібы я меў намер рэвізаваць вучэнне Маркса".[59]

Тэарэтычныя пошукі ў галіне адносінаў паміж паламі ў Савецкай Беларусі падсумавала навукова-папулярная брашура беларускага ўрача-гігіеніста З.Ц. Шміта, падрыхтаваная ў 1930 г. У ёй аўтар, паводле яго словаў, спалучыў сацыялагічны і біялагічны падыходы да асэнсавання вызначаных праблем. Мінскі ўрач прапанаваў чытачам ужываць слова "каханне", як буржуазнае, толькі ў двукоссі (са спасылкай на Стэндаля; ён называе чатыры тыпы гэтага састарэлага пачуцця: каханне-пал, прыгожае каханне, пачуццёвае каханне, нарэшце, ганарлівае каханне). Фізіялагічнай асновай шлюбу, на думку Шміта, з'яўляецца "плоцьны поцяг". Дзетанараджэнне ён разглядаў як "прадукт біолёгічнага падзелу працы". У ліку найважнейшых умоў стварэння камуністычнай сям'і аўтар называе: вызваленне жанчыны з "кухонных путаў", перанясенне функцыі выхавання дзяцей у калектыў і ўцягванне жанчыны ў выт-

[58] Е. Кіпель, *Аснова маралі*, Нью Ёрк 1953, с. 11.
[59] Я. Кіпель, *Эпізоды*, Мінск 2013, с. 105.

ворча-грамадскую працу. Як урач, Шміт выступаў за сэксуальнае выхаванне дзяцей, а таксама забарону ўступаць у шлюб па медыцынскіх паказчыках.

Разам з тым, аўтар, адчуваючы паварот у дзяржаўнай сямейна-шлюбнай палітыцы, кажа пра новую сацыялістычную манагамію, права маці на сямейнае выхаванне дзяцей, а таксама сублімацыю сэксуальнай энергіі. Ён упэнены, што хутка прыйдзе той час, калі “чалавецтва ачалавечыць свае жывёльныя палы, яно адмовіцца ад налётчыкаў любові, растратчыкаў плоцьнай энэргіі і будзе пераключаць гэту сваю энэргію на ток высокага напружаньня грамадзкае творчасьці”.[60]

Такім чынам, на працягу 1920-х гадоў, разам з іншымі савецкімі рэспублікамі, БССР стала палігонам для выпрабавання розных тэорый і канцэпцый, якія прапаноўвалі новыя альбо тлумачылі старыя ўзаемаадносіны палоў[61]. Яны ствараліся сацыёлагамі, біёлагамі, урачамі і, канешне, кіраўнікамі маштабнага эксперымента – партыйнымі ідэолагамі. Унутры палітычнай і навуковай эліты ў той час яшчэ маглі існаваць побач несупадаючыя погляды на “палавое пытанне”. Пра плюралізм думкі сведчыла адпраўка летам 1926 г. з СССР у Афрыку экспедыцыі прафесара І.І. Іванова з мэтай “вырашэння аднаго з буйнейшых пытанняў, што стаяць перад чалавечым розумам”, а менавіта “скрыжавання чалавека з малпаю”.[62] Спробы вытлумачыць матывы і асаблівасці сэксуальных паводзінаў чалавека з дапамогай марксісцкай тэорыі карысталіся вялікім попытам

[60] З. Ц. Шміт, *Род і здароўе, шлюб і сям’я,* Менск 1931, с. 17, 23, 29, 48.

[61] Разам з айчыннымі, наватарскімі, тагачаснай савецкай, у т. л. і беларускай чытаючай публіцы былі даступны лепшыя ўзоры заходняй сэксалагічнай думкі, такія як класічная праца доктара Т.Г. Ван-дэ-Вельдэ, аўтар якой без усялякага сэксуальнага эксперыментатарства, шчыра і адказна імкнуўся дапамагчы людзям дасягнуць доўгатэрміновага шчасця ў манагамным шлюбе, заснаваным на фізіялагічнай і псіхалагічнай гармоніі, і, пажадана, каханні. Гл.: Т. Г. Ван-де-Вельде, *Техника брака. Совершенный брак – опыт исследования и техники,* Харьков 1928, 256 с.

[62] *Чырвоная зьмена*, 1926, № 77, с. 4.

і даверам перш за ўсё ў гарадскога насельніцтва, пераважна моладзі. Дзякуючы публічнай дыскусіі, сэксуальныя адносіны паступова набывалі новае, палітычнае вымярэнне.

Тэарэтычныя пошукі ў галіне новых сямейна-шлюбных адносінаў знайшлі свае ўвасабленне ў савецкай нарматворчасці, заканадаўчых актах.

## Спробы стварэння юрыдычнага падмурку

На заканадаўчым узроўні савецкая дзяржава рэгулявала сэксуальныя паводзіны насельніцтва з дапамогай сямейнага і крымінальнага права. Савецкае сямейнае права ўтварала сістэму юрыдычных нормаў, якія рэгламентавалі грамадскія адносіны, што паўставалі з факта шлюбу і прыналежнасці да сям'і. Большая частка гэтых адносінаў, такіх як каханне, узаемная павага, асабістая свабода, адказнасць, давер, адданасць, сямейнае выхаванне мелі немаёмасны характар. Аднак, шлюб нараджаў таксама маёмасныя адносіны – з'яўлялася агульная маёмасць, абавязкі ўзаемнай матэрыяльнай падрымкі, утрымання дзяцей і інш. У сферу кампетэнцыі крымінальнага права ўваходзілі злачынствы на сэксуальнай глебе – гвалтаванне, разбэшчванне, арганізацыя сэксуальных паслуг.

Падмурак новых шлюбна-сямейных адносінаў у СССР заклалі ўжо першыя дэкрэты савецкай улады, якія абвясцілі юрыдычнае разняволенне жанчыны, яе раўнанне ў правах з мужчынам ва ўсіх сферах жыцця. 18 снежня 1917 г. Ленін падпісаў дэкрэт "Аб грамадзянскім шлюбе, аб дзецях і аб увядзенні кніг грамадзянскага стану",[63] 19 снежня – дэкрэт "Аб скасаванні шлюбу".[64] Гэтыя дэкрэты пазбавілі мужчыну права кіраўніцтва сям'ёй, дэкларавалі

[63] *Декрет ВЦИК, СНК РСФСР от 18.12.1917 «О гражданском браке, о детях и о введении книг актов гражданского состояния»*. [Электронный ресурс]. Режим доступа: http://www.lawmix.ru/docs_cccp.php?id=8234

[64] *Декрет ВЦИК, СНК РСФСР от 19.12.1917 «О расторжении брака»*. [Электронный ресурс]. Режим доступа: http: //www.lawmix.ru/docs_cccp.php?id=8230.

матэрыяльнае і сэксуальнае самавызначэнне жанчыны, абвясцілі яе права на вольны выбар прозвішча, месца жыхарства і грамадзянства, чаго ў той час не было ні ў заходнееўрапейскіх краінах ні ў ЗША. Асноўныя прынцыпы савецкай палітыкі ў галіне шлюбна-сямейных адносінаў былі замацаваны ў прынятым у Савецкай Расіі Кодэксе 1918 г. аб актах грамадзянскага стану, шлюбным, сямейным і апекунскім праве, які дзейнічаў таксама на тэрыторыі БССР[65]. Заканадаўца даў у Кодэксе правобраз камуністычнай сям'і, якая грунтуецца на ідэальным каханні двух асобаў featuring рознага полу. Уступленне ў шлюб дазвалялася мужчынам, якія дасягнулі 18 гадоў і дзяўчынам, якія дасягнулі 16 гадоў, але ў пэўных абставінах узроставая планка магла быць зніжана. У рэчышчы лозунга эпохі ваеннага камунізму аб знішчэнні прыватных маёмасных адносінаў, аўтары Кодэкса мелі на ўвазе сям'ю будучага, цалкам вызваленую ад "маёмасных ланцугоў".

На практыцы гэта ўвасобілася ва ўвядзенні ў сямейны Кодэкс 1918 г. дарэвалюцыйнай нормы сямейнага права аб раздзельным валоданні супругамі маёмасці, якая распаўсюджвалася на дваран і гарадское саслоў'е (сялянскія сямейныя маёмасныя спрэчкі вырашаліся з дапамогай звычаёвага права). Паводле імперскага сямейнага кодэкса, ні муж, ні жонка не мелі права карыстацца і кіраваць маёмасцю супрага(-і) без спецыяльнага дазволу. Аднак, распаўсюджванне гэтай, у цэлым прагрэсіўнай нормы права, распрацаванай для абароны эканамічных інтарэсаў жанчын прывілеяваных класаў на ўсё насельніцтва краіны прывяло да нечаканых вынікаў. У выпадку развода цярпела не маючая правоў на маёмасць мужа, у тым ліку і на набытую ім у шлюбе, неработаючая жанчына з дзецьмі. Гэтая катэгорыя жанчын была дамінуючай на абшарах былой Расійскай імперыі.

---

[65] *Кодекс законов об Актах гражданского состояния, Брачном, Семейном и Опекунском праве*, "Собрание узаконений и распоряжений рабочего и крестьянского правительства", 1918, № 76–77, с. 933–959.

Кодэкс прызнаў выключнае права ЗАГСаў рэгістраваць шлюбы. Царкоўны шлюб абвяшчаўся перажыткам, а разам з ім таксама традыцыйная сям'я. Нягледзячы на тое, што афіцыйна вянчанне забаронена не было, толькі шлюб, зарэгістраваны ў ЗАГСе, нараджаў правы і абавязкі мужа і жонкі. Вянчанне ў культавых установах усіх канфесій было забаронена без папярэдняй афіцыйнай рэгістрацыі шлюбу ў ЗАГСе. Апошняя забарона была адменена ў ліпені 1924 г. рашэннем Наркамата юстыцыі і Наркамата ўнутраных спраў БССР у сувязі з тым, што "рэлігійныя абрады зусім страцілі ўсялякае юрыдычнае значэнне для дзяржавы".[66]

У сакавіку 1922 г. калегія НКУС БССР усталявала наступныя тарыфы на аплату паслуг ЗАГСаў. За запіс аб нараджэнні спаганялася з прыватных асоб – 50 кап., членаў прафсаюза – 25 кап., за рэгістрацыю шлюбу спаганялася з прыватных асобаў – 5 руб., членаў прафсаюза – 2 руб., за развод – з усіх грамадзян спаганялася 15 руб.[67] У чэрвені 1922 г. быў уведзены гербавы збор за ўсе метрычныя пасведчанні, што выдаваліся ЗАГСамі ў памеры 5 рублёў (сярэдні заробак прамысловага рабочага ў той час складаў каля 50 рублёў у месяц).[68].

25 ліпеня 1922 г. газета "Звязда" паведамляла, што для заключэння грамадзянскага шлюбу ў ЗАГС жаніх і нявеста павінны мець пашпарты[69]. Жаніх да таго ж павінен быў мець копію ўліковай карткі з ваенкамата. Калі гэтыя дакументы адсутнічалі, то жаніх мог пацвердзіць сваю асобу з дапамогай службовага пасведчання, нявеста – з дапамогай копіі метрычнага запісу, выдадзенага ЗАГС (метрычныя запісы, выдадзеныя служыцелямі рэлігійнага культа лічыліся несапраўднымі). Для ўступлення ў шлюб ваенаслужачым было дастаткова прад'явіць чырвонаармейскую кніжку. Удаўцы і ўдовы мусілі прад'явіць пасведчанні аб смерці жонкі ці мужа. Пасвед-

[66] *Звезда*, 1924, № 162, с. 6.
[67] *Звезда*, 1922, № 75, с. 4.
[68] *Звезда*, 1922, № 125, с. 4.
[69] У ліпені–жніўні 1922 г. праводзілася пашпартызацыя жыхароў БССР.

чанні і даведкі, выдадзеныя грамадзянам дамкамамі, не прымаліся. На рэгістрацыі шлюбу патрабавалася прысутнасць дзвюх сведкаў.[70]

Як частку дзяржаўнай палітыкі трэба разглядаць спробы ўжыць на практыцы вынікі еўгенічных даследаванняў, якія ў рамках сацыяльнай гігіены актыўна развіваліся ў СССР у 1920-я гг. У жніўні 1923 г. Наркамат аховы здароўя БССР распрацаваў пастанову, адпаведна якой асобы, што збіраліся пабрацца шлюбам павінны былі абмяняцца пасведчаннямі аб стане здароўя, у прыватнасці аб наяўнасці ў іх псіхічных, венерычных і іншых захворванняў, што маглі перадацца нашчадкам.[71]

Скасаванне шлюбу, якое ў дарэвалюцыйны час было звязана з вялікімі цяжкасцямі, адпаведна кодэксу 1918 г. максімальна спрашчалася. "Спыненне палавога сажыцельства супругаў ёсць фактычнае растаржэнне шлюбу і заканадаўца, прызнаючы гэты прынцып як асноўны, спрасціў працэдуру разлукі да мэтазгоднага мінімума" – тлумачыў кодэкс жыхарам рэспублікі члена Прэзідыўма ЦВК БССР В.П. Грузель.[72] Развод ажыццяўляўся праз суд паводле пісьмовага альбо вуснага звароту мужа альбо жонкі, ці праз ЗАГС па жаданні абодвух альбо аднаго з бакоў. Шлюб не ствараў агульнай маёмасці мужа і жонкі, што на практыцы прыводзіла да эканамічнай залежнасці жонкі ад мужа, бо большасць жанчын у той час з'яўляліся хатнімі гаспадынямі. Сітуацыя ўскладнялася слабасцю дзяржаўных службаў сацыяльнай дапамогі адзінокім жанчынам з дзецьмі. У падобных эканамічных, юрыдычных, культурных рэаліях сэксуальныя адносіны ў горадзе і вёсцы часта прыводзілі да сумных, а часам трагічных наступстваў, перш за ўсё для жанчын і дзяцей.

29 мая 1925 г. ЦВК и СНК БССР прынялі пастанову "Да парадку разгляду спраў па скасаваньні шлюбаў і па выдачы ўтрыманьня незабясьпечанаму супругу і дзецям", мэтай якой было ўпарадкаванне

[70] *Звезда*, 1922, № 174, с. 4.
[71] Врач Е. Ш-н, *Здоровый брак*, "Звезда", 1923, № 191, с. 5.
[72] НАРБ, ф. 4п, воп. 1, спр. 2378, Пратакол паседжання ЦВК БССР, арк. 2.

працэдуры развода, а таксама ўмацаванне матэрыяльнага становішча жанчыны пасля разводу. Пастанова змяшчала наступныя восем пунктаў: "

1. Развод робіцца як па згодзе абодвух супругаў, гэтак і па жаданьні аднаго з іх разьвесціся.
2. Заявы аб скасаваньні шлюбаў падаюцца па месцы пражываньня аднаго з супругаў у пісьмовай ці вуснай форме.
3. Калі заяўшчык не мае дакументаў, засьведчаючых запіс касуемага шлюбу, ён падае ў ЗАГС заяву аб гэтым, азначыўшы месца і час утварэння шлюбу і прымае на сябе адказнасць за праўдзівасць гэтых вестак.
4. Калі заява ў органы ЗАГС падаецца адным з супругаў, то другому супругу паведамляецца аб пададзенай заяве, таксама высылаецца копія запісу аб скасаваньні шлюбу па адрасе, азначаным заяўшчыкам. УВАГА: Калі адрас другой стараны невядомы, то ў памяшканьні ЗАГС вывешваецца апавяшчэньне аб тым, што справа будзе разгледжана праз месяц. Неяўка не прыпыняе разгляду справы. Такое самае апавяшчэньне зьмяшчаецца ў мясцовай або цэнтральнай афіцыйнай газэце.
5. Незабяспечаны і непрацаздольны супруг у выпадку разводу мае права на палучэньне ўтрымання ад другога супруга, калі толькі апошні, паводле прызнаньня суда, можа даваць яго.
6. Права на ўтрыманне мае не толькі непрацаздольны разведзены супруг, але і працаздольны ў часе яго безпрацоўя, аднак у працязе не больш году з дню разводу. Увага: у выпадку наўмыснага ўхіленьня ад працы разведзенага супруга, другі бок можа падаць іск аб вызваленьні яго ад гэтага абавязку.
7. Права на ўтрыманне маюць таксама асобы, якія знаходзіліся ў фактычным, не запісаным шлюбе, як гэта пазначана ў артыкулах 5 і 6.
8. Умаўленне паміж развадных супругаў аб тым, пры кім з іх і хто з дзяцей застаецца на выхаваньне, хто з іх і якую долю

расходаў на іх утрыманьне і выхаваньне возьме на сябе і размер утрымання незабяспечанаму супругу запісваецца органам ЗАГС у асобы пратакол. Выдаецца яго асобнік кожнаму з супругаў. Рашэнне ЗАГС можна дамагацца змяніць у працэсуальным парадку праз суд.

Старшыня ЦВК А. Хацкевіч. За старшыню ЦВК З. Чарнушэвіч. Старшыня СНК Я. Адамовіч."[73]

15 лістапада 1928 г. выйшаў сумесны цыркуляр Наркамюста і НКУС "Пра парадак уручэньня павестак аб разводзе асобам, якія пражываюць за межамі Саюзу ССР", адпаведна якому шлюб паміж грамадзянінам СССР і замежнікам растаргалі па жаданні аднаго з бакоў у адсутнасці замежнага супруга на агульных асновах. Судовае рашэнне высылалася за межу праз савецкае консульства.[74]

Сумеснай пастановай наркаматаў юстыцыі і аховы здароўя РСФСР, прынятай 18 лістапада 1920 г. было дазволена штучнае перапыненне цяжарнасці ў медыцынскіх установах, незалежна ад таго пагражае ці не здароўю жанчыны далейшае выношванне плоду. Такім чынам, Савецкая Расія (а разам з ёю і Савецкая Беларусь) стала першай краінай свету, якая дазволіла ўласным грамадзянкам рабіць аборты без абмежаванняў. Гэты дазвол разглядаўся ўладай хутчэй як часовы захад, непазбежнае сацыяльнае зло, чым медыка-юрыдычная норма, якая дазваляла жанчынам самастойна прымаць рашэнні рэпрадукцыйнага характару.

Першы Крымінальны кодэкс РСФСР 1922 г. (які дзейнічаў таксама на тэрыторыі Савецкай Беларусі) прадугледжваў досыць мяккае пакаранне за такія віды сэксуальных злачынстваў, як згвалтаванне (не менш 3 гадоў) і разбэшчванне непаўналетніх (да 5 гадоў). Артыкул 170 Кодэкса прадугледжваў за прымушэнне да заняткаў

[73] НАРБ, ф. 6, воп. 1, спр. 564, Пастановы ЦВК і СНК БССР, арк. 13–14.
[74] НАРБ, ф. 99, воп. 2, спр. 662, Цыркуляры Наркамюста БССР, арк. 94.

прастытуцыяй не менш 3 гадоў зняволення са строгай ізаляцыяй. Артыкул 171 за зводніцтва, утрыманне прытонаў распусты, а таксама вярбоўку жанчын для заняткаў прастытуцыяй таксама не менш 3 гадоў са строгай ізаляцыяй. У выпадку ўцягвання ў заняткі прастытуцыяй непаўналетніх тэрмін зняволення павялічваўся да 5 гадоў. Са старага, імперскага Укладання аб пакараннях ў савецкі крымінальны кодэкс не перайшлі артыкулы, якія прадугледжвалі ссылку ў Сібір за мужаложства і скаталожства.[75]

Усе пазначаныя артыкулы перайшлі ў Крымінальны кодэкс БССР, прыняты ў 1928 г. Васьмігадовая судовая практыка прымусіла беларускіх законатворцаў змяніць пакаранні за сэксуальныя злачынствы ў бок іх узмацнення. Так, 233-ці артыкул "Палавыя зносіны з асобамі, якія не дарасьлі да палавой сьпеласьці" выклікаў пазбаўленне волі без строгай ізаляцыі да 3 гадоў, 235-ы артыкул "Палавыя зносіны з фізычным гвалтам" – да 5 гадоў", 236-ы артыкул у частцы а "Прымушэньне займацца прастытуцыяю, зводніцтва, утрыманьне прытонаў распусты, а таксама ўцягваньне жанчын у прастытуцыю" – да 5 гадоў са строгай альбо без строгай ізаляцыі, у частцы Б "Такія самыя дзеяньні, калі ўцягнутыя ў прастытуцыю былі непаўналетнімі" – са строгай ізаляцый да 8 гадоў. Акрамя таго, у беларускую судовую практыку ўводзілася пакаранне да 3 гадоў без строгай ізаляцыі за наўмыснае заражэнне цяжкой венерычнай хваробай (за неданясенне асобаў да таго абавязаных уладам аб выпадках венерычных захворванняў быў прадугледжаны штраф да 300 рублёў альбо прымусовыя працы).[76] Сацыяльна-эканамічныя рэаліі эпохі НЭП вымагалі рэфармавання савецкага шлюбнага заканадаўства. Для яго рэфарматараў асноўная праблема хавалася ў няпэўным і ўразлівым статусе жонак, якія знаходзіліся ў незарэгістраваным, т. зв. фактычным шлюбе. Падобныя шлюбы

[75] *Уголовный кодекс РСФСР*, Москва 1924, с. 624–626.

[76] *Крымінальны кодэкс Б.С.С.Р. (прыняты 19 кастр. 1928 г.)*, "Збор законаў і загадаў Рабоча-Сялянскага Ўраду Б.С.С.Р.", 1928, № 30, с. 897–899.

былі распаўсюджаны сярод расійскай рэвалюцыйнай інтэлігенцыі, прадстаўнікі якой не жадалі брацца царкоўным шлюбам па ідэялагічных альбо канспіратыўных матывах. Нягледзячы на тое, што фактычныя шлюбы не ўзгадваліся ў Кодэксе 1918 г., яны атрымалі шырокае распаўсюджванне пераважна ў гарадах. Фактычныя шлюбы былі выгодныя для мужчын. Адпаведна, іх ахвярамі ў большасці выпадкаў рабіліся жанчыны з дзецьмі, бо факт бацькоўства ў судзе даказаць было вельмі цяжка. З-за падзелу маёмасці падчас разводу ахвярамі рабіліся і тыя жанчыны, якія знаходзіліся ў зарэгістраваным шлюбе.

Праект уласнага беларускага Кодэкса законаў аб шлюбе, сям'і і апецы быў вынесены на спецыяльнае абмеркаванне на жнівеньскай (1926 г.) сесіі ЦВК БССР. Падчас абмеркавання, якое праходзіла пад старшынствам А.Р. Чарвякова, высветліліся два супрацьлеглыя падыходы да галоўнага пытання – фактычнага шлюбу. Думкі тых, хто падтрымліваў яго заканадаўчае афармленне агучыла ў сваім выступе загадчыца жанаддзела ЦК КП(б)Б, рэдактар часопіса "Беларуская работніца і сялянка" М.Ф. Муратава. Яна нагадала пра тое, што фактычны шлюб на заканадаўчым узроўні ўжо існуе ў РСФСР і з пэўнымі абмежаваннямі[77] ва Украінскай ССР. Назваўшы зарэгістравны шлюб "перажыткам буржуазнага мінулага", прыхільніца тэорыі "крылатага Эраса" паведаміла, што ў БССР ужо каля 100 тыс. чалавек жывуць фактычным шлюбам. Сведчаннем дэградацыі зарэгістраванага шлюбу, на яе думку, была яго скарабежнасць – нядаўна "адзін чалавек быў зарэгістраваны 13 разоў".

---

[77] Ва ЎССР фактычным шлюбам лічылася сумежнае пражыванне асобаў рознага полу тэрмінам больш дзвюх гадоў, альбо на працягу меншага тэрміна калі жанчына зацяжарыла ці нарадзіла дзіця. Падобнае вызначэнне фактычнага шлюбу ставіла больш пытанняў, чым давала адказаў. Вось некаторыя з тых, што прагучалі на жнівеньскай (1926) сесіі ЦВК БССР: чаму менавіта дзвюхгадовы тэрмін сумеснага пражывання пераўтвараў сужыцце ў шлюб? Ці з'яўляецца цяжарнасць у выніку выпадковага сэксуальнага кантакту падставай для кваліфікавання апошняга як фактычнага шлюбу?

Муратава мела моцнага саюзніка ў асобе намесніка старшыні СНК БССР М.М. Каркліна, які адначасова з’яўляўся старшынёй Камісіі заканадаўчых прапаноў пры СНК. Ён падтрымліваў прынцып неабавязковасці рэгістрацыі шлюбу, лічыў, што фактычны шлюб нараджае тыя ж маёмасныя правы і абавязкі супругаў, што і шлюб зарэгістраваны.[78]

Пазіцыю праціўнікаў фактычнага шлюбу на абмеркаванні выказаў наркам юстыцыі М.А. Сегаль, які выступаў за моцны, зарэгістраваны ў дзяржаўных органах шлюб. Яго галоўным аргументам быў неаспрэчны факт, што ў выніку распаду фактычнага шлюбу, абараняць уласныя правы даводзіцца слабому боку – жанчыне і дзецям. Былі ў наркама і іншыя аргументы: “Калі прыраўнуем фактычны шлюб да зарэгістраванага, то можна сутыкнуцца з такой акалічнасцю: уявеце сабе, што калі хто-небудзь мае 3–4 фактычныя жонкі і гэты шлюб прыроўніваецца да зарэгістраванага юрыдычнага шлюбу з усімі вынікамі… гэта вядзе да мнагажонства. Па такім шляху мы йсці ня можам”, “суды завалены справамі аб аліментах”.

У якасці альтэрнатывы легалізацыі фактычнага шлюбу Сегаль прапанаваў дэталёвую працэдуру ўсталявання бацькоўства: цяжарная жанчына ці маці нованароджанага на працягу месяца пасля нараджэння падае заяву ў ЗАГС з указанем імя таго, хто з’яўляецца бацькам. ЗАГС на працягу 7 дзён паведамляе пра гэта бацьку і дае яму месяц на роздум і афіцыйны адказ. Калі меркаваны бацька адмаўляецца прызнаць дзіця, ён павінен падаць заяву ў суд і аспрэчваць заяву ў судовым парадку. Калі падобнай заявы няма – ён аўтаматычна лічыцца бацькам. У гэтым выпадку аспрэчваць бацькоўства давядзецца ў агульнаіскавым парадку.[79]

[78] НАРБ, ф. 99, воп. 2, спр. 536, Пратакол жнівеньскай (1926 г.) сесіі ЦВК БССР, арк. 66–73.

[79] НАРБ, ф. 99, воп. 2, спр. 536, Пратакол жнівеньскай (1926 г.) сесіі ЦВК БССР, арк. 222–327.

Супрацоўнік Наркамата РСІ–ЦКК КП(б)Б К.Ф. Бенек, канстатуючы, што “робіцца страхацьцё, распуста цьвіце, няма ніякіх межаў… трэба належыць цуглі як на мужчыну так і на жанчыну”, выступаў за роўнасць зарэістраванага з фактычным шлюбам, прапанаваў усю маёмасць супругаў, нажытую да шлюбу паасобку і разам у шлюбе пасля разлукі дзяліць папалам, звярнуў увагу прысутных на цяжкавыканальнасць пункта 42 праекта Кодэкса, дзе размова ішла пра спагнанне аліментаў з некалькіх мужчын, з якімі жанчына жыла разам (у канчатковым выглядзе Кодэкс законаў аб шлюбе прадугледжваў спагнанне аліментаў з аднаго канкрэтна вызначанага бацькі). Дэпутат Калінін выказаўся за фактычны шлюб для горада і зарэгістраваны для вёскі, а таксама супраць таго, каб абкладаць аліментамі сялянскую гаспадарку ў выпадку, калі бацька-селянін плаціць іх не ў стане (“сын дзесці бадзяўся, зрабіў алімэнт, а бацька за яго плаці”). Дэпутат Нікіфарэнка прапанаваў абмежаваць колькасць шлюбаў трыма, бо “…ёсць у нас такія, што ня толькі па 7 жон мелі, але і па 12”. Дэпутат Іванькова адзначыла, што сэксуальная свабода мужчын вядзе да “пашырэньня і разьвіцьця праституцыі як на вёсцы, так і ў горадзе” і дадала, што ведае толькі адзін выпадак, калі на судзе мужчына прызнаўся і сказаў: “Але – гэта маё дзіця””.[80]

З боку дэпутатаў-жанчын, большасць якіх падтрымала пазіцыю М.Ф. Мураталвай, гучалі прапановы ўзаконіць фактычны шлюб (“селянін будзе ведаць – няма чаго гуляць з нейкай дзяўчынай, бо яго маёмасць у аднолькавай небяспецы як у зарэгістраваным, так і ў фактычным шлюбе”), а таксама абмежаваць максімальную колькасць шлюбаў трыма. Мужчыны пераважна выказалі падтрымку толькі зарэгістраванаму шлюбу, звяртаючы ўвагу прысутных на небяспеку маніпуляцый з боку недабрасумленных жанчын (“жаночую нагласць”).[81]

---

[80] *Матэрыялы па пытанні аб шлюбе, сям’і і апецы*, Менск 1926, с. 18, 32, 39.

[81] НАРБ, ф. 99, воп. 2, спр. 536, Пратакол жніввеньскай (1926 г.) сесіі ЦВК БССР, арк. 300.

Па выніках абмеркавання, члены ЦВК БССР вырашылі вынесці праект беларускага Кодэкса законаў аб шлюбе, сям'і і апецы на абмеркаванне шырокіх мас. Але беларускія вучоныя пачалі абмеркаванне гэтага пытання яшчэ да жнівеньскай сесіі ЦВК БССР. У лютым 1926 г. прыхільнік стрыманай пазіцыі, гісторык-эканаміст, выкладчык БДУ І.В. Герчыкаў, які выступаў за стварэнне манагамнай сацыялістычнай сям'і, заснаванай на каханні і супрацоўніцтве, а таксама сацыялізацыю толькі дашкольнага выхавання дзяцей, пазнаёміў чытачоў часопіса "Полымя" з ходам абмеркавання новага праекта расійскага кодэкса.[82]

Абмеркаванне ж уласна беларускага кодэкса распачаў прафесар БДУ, вядомы спецыяліст у галіне грамадзянскага і сямейнага права М.В. Грэдынгер. З'яўляючыся прыхільнікам меркаванай легалізацыі фактычнага шлюбу, ён уступіў у палеміку з заходнееўрапейскімі юрыстамі, якія характарызавалі практыку падобных шлюбных адносінаў як вяртанне ў першабытнае грамадства. Размову пра беларускі праект Кодэкса законаў аб шлюбе, сям'і і апецы аўтар вёў, параўноўваючы яго з аналагічнымі праектамі, распрацаванымі ў РСФСР і УССР.[83]

Прыхільнік фактычнага шлюбу і лёгкага разводу, а таксама "парасткаў новага быту" дацэнт кафедры канстытуцыйнага права БДУ М.А. Канаплін высунуў наступныя аргументы на карысць уласнай пазіцыі: "Апрача таго, што [у выніку легалізацыі толькі зарэгістраванага шлюбу *А.Г.*] на сцэну з'яўляюцца дзеці першае і другое катэгорыі… у кожным разе лік задушаных і ў студні кінутых або проста "падкінутых" дзяцей павялічыцца, колькасць абортаў і сьлёз матак, трэба думаць, таксама ня зьменшыцца".[84]

---

[82] І. Герчыкаў, *Новы асаблівы дакумент соцыялістычнай праватворчасьці*, "Полымя", 1926, № 2, с. 67–77.

[83] М. Грэдынгер, *Найважнейшыя моманты ў будучым заканадаўстве аб сям'і*, "Полымя", 1926, № 8, с. 145–154.

[84] Н. Конаплін, *Два пытаньні (Да дыскусіі аб шлюбе і сям'і)*, "Полымя", 1926, № 8, с. 157.

Уласнае разуменне маёмасных узаемаабавязкаў мужа і жонкі ў сацыялістычным грамадстве прапанаваў асістэнт кафедры грамадзянскага права БДУ Ф.І. Гаўзэ.[85]

Неўзабаве пасля пачатку абмеркавання праекта Кодэкса законаў аб шлюбе ў сталіцы, дыскусія перайшла на старонкі акруговага перыядычнага друку. Вось як яна адбывалася ў Бабруйску. Першым у мясцовым друку на азначаную тэму выказаўся акруговы суддзя Іваніцкі, які паставіў пад сумненне неабходнасць узаконення фактычнага шлюбу, бо за яго трохгадовую практыку было толькі два выпадкі, калі суд не прызнаваў фактычны шлюб. На яго думку, правы супругаў былі добра абаронены пастановай "Аб парадку разбору спраў аб скасаванні шлюбаў і аб выдачы ўтрымання жонкам і дзецям, якія маюць у гэтым патрэбу", прынятай ЦВК БССР 29 мая 1925 г.[86]

Па меркаванні селькора бабруйскага "Камуніста" Пукінскага, "…калі маці сужэнцавала з некалькімі мужчынамі аднachасова, дык плаціць на ўтрыманне дзіця павінны альбо ўсе гэтыя мужчыны, альбо ніводны з іх, другі спосаб нават лепшы". Тэму лёсу дзяцей, што нарадзіліся ў выніку палігамнага жыцця працягнуў іншы карэспанэнт газеты М. Корзун: "Вельмі сур'ёзнае пытанне, каго лічыць бацькам дзіця? Калі з жанчынай сужэнцавалі некалькі мужчын, дык чаму бацькам лічыць толькі аднаго з іх, і калі аднаго, дык чаму менавіта таго, а не іншага з тых, хто сужэнцаваў? У такіх выпадках, калі ніхто не можа ведаць хто бацька дзіця, дзіцю трэба даць прозвішча маці і адправіць у дзіцячы дом на выхаванне. а для ўтрымання такіх дзетак, добра было б увесці адмысловы падатак на халасцякоў звыш 30 гадоў". Іншыя карэспандэнты выказвалі засцярогу, што ў выпадку спагнання аліментаў з усіх меркаваных бацькоў, "…як бы ў нас не з'явіліся спецыялісткі-аліментшчыцы".[87]

---

[85] Ф. І. Гаўзэ, *Маёмасныя адносіны супругаў па кодэксах законаў аб шлюбе, сям'і і апецы БССР, РСФСР і УССР*, "Працы Беларускага Дзяржаўнага Універсытэту ў Менску. Факультэт права і гаспадаркі", 1928, № 21, с. 53.

[86] Иваницкий, *О семье, браке и опеке*, "Камуніст", 1926, № 122, с. 3.

[87] *Камуніст*, 1926, № 123, с. 2.

Жыхары беларускіх вёсак, мястэчак, гарадоў мелі магчымасць выказаць свае думкі адносна праекта Кодэкса законаў аб шлюбе, сям'і і апецы не толькі ў перыядычным друку, але таксама ў адкрытых дыскусіях. Адна з іх, прысвечаная ўзаконенню фактычнага шлюбу адбылася 28 жніўня 1926 г. у памяшканні 1-га віцебскага драмтэатра.[88] Трэба адзначыць, што найбольш актыўны ўдзел у абмеркаванні праекта Кодэкса, як у друку, так і ў публічных дыскусіях бралі мужчыны. Большасць жанчын, выконваючы сваю традыцыйную гендэрную ролю, сціпла трымаліся ў цені. Выключэннем былі жанчыны-дэлегаткі, якія са старонак часопіса "Беларуская работніца і сялянка" на працягу 1926 г. рэгулярна патрабавалі ўскладнення працэдуры развода.

Намаганні рэфарматараў шлюбна-сямейнай сферы ўвасобіліся ў беларускім Кодэксе законаў аб шлюбе, сям'і і апецы, які зацвердзіла IV сесія ЦВК БССР VII склікання 27 студзеня 1927 г.[89] У цэлым Кодэкс працягваў ліберальную традыцыю ў сферы сям'і і сямейных адносінаў, якая склалася ў першыя паслярэвалюцыйныя гады. У ім у значнай ступені ўвасобіліся ідэі прыхільнікаў вызвалення "крылатага Эраса". Так, ён адрозніваўся ад Кодэкса 1918 г. тым, што незарэгістраваныя, фактычныя шлюбы прыраўноўваліся па юрыдычных абавязках мужа і жонкі да зарэгістраваных шлюбаў. Наяўнасць фактычнага шлюбу ў выпадку разводу пазоўніку трэба было даказаць у судзе. Акрамя таго, уся маёмасць, нажытая мужам і жонкай у шлюбе прызнавадася агульнай. У выніку муж ці жонка, нават калі не мелі падчас сумеснага пражывання самастойнага прыбытку, атрымалі права на частку сямейнай маёмасці. Дзеля заахвочвання зарэгістраваных шлюбаў была яшчэ больш спрошчана працэдура развода. Стала не патрэбна тлумачыць яго прычыны, спрачацца, даказваць, прыцягваць сведкаў. Такім чынам, Кодэкс 1927 г. замацаваў у якасці юрыдычнай нормы зарэгістраваны гра-

[88] *Заря Запада*, 1926, № 192, с. 3.
[89] *Кодэкс законаў аб шлюбе, сям'і і апецы Б.С.С.Р.*, Менск 1927, 66 с.

мадзянскі і незарэгістраваны фактычны шлюб, развод, магчымасць стварэння сям'і без дазволу бацькоў і апекуноў. За заведама фальшывыя заявы аб устанаўленні бацькоўства належала крымінальная адказнасць.

Жыхары беларускай вёскі ў сваёй масе адмоўна паставілася да Кодэкса 1927 г., перш за ўсё з-за фінансавай уразлівасці сялянскай гаспадаркі ў выпадку распада шлюбнага саюзу. Жансаветы крытыкавалі яго за недастатковую абарону правоў жанчын. Таму ўжо ў 1928 г. Наркамюст БССР быў вымушаны ўнесці ў Кодэкс папраўкі, якія ўзмацнялі абарону маці і дзіця. Так, пад пагрозай крымінальнай адказнасці бацька дзяцей быў абавязаны паведамляюць матку аб перамене свайго месца жыхарства і працы. Айчым ці мачыха, якія ўжо некаторы час утрымлівалі дзяцей былі абавязаны даваць сродкі на іх утрыманне і надалей. Судам дазвалялася прыпыняць справы аб выдзеле з сельскай гаспадаркі, калі асоба, якая выдзялялася, рабіла гэта з мэтаю ўнікнуць уплаты аліментаў. Акрамя таго, усталёўваўся мінімальны ўзрост уступлення ў шлюб для абодвух палоў – 18 гадоў.[90]

Заканатворцы першага дзесягоддзя савецкай улады прадэманстравалі радыкальныя падыходы да мадэрнізацыі сям'і, шлюбу, сэксуальных узаемаадносінаў. Скасаванне саслоўных, рэлігійных, маёмасных абмежаванняў для ўступлення ў шлюб, абвяшчэнне прынцыпаў дабраахвотнасці шлюбу, роўнасці супругаў, легалізацыя фактычнага шлюбу на практыцы прывялі да няпэўнасці і супярэчнасці заканадаўчых нормаў, расхіставання асноў традыцыйнай сям'і.

## Заключэнне

Укараненне ў практыку сямейна-шлюбных і сэксуальных адносінаў у Савецкай Беларусі ў 1920-я гг. новых ідэй і юрыдычных норм прывяло да дэзарганізацыі традыцыйнага сямейнага ладу і нар-

[90] *Зьвязда*. 1928, № 253, с. 4.

матыўнай няпэўнасці, паслаблення інстытута шлюбу і заснаванай на ім сэксуальнай маралі, рэзкаму павелічэнню колькасці абортаў, росту прастытуцыі і венерычных захворванняў. 1920-я гады сталі часам сэксуальнай рэвалюцыі – маштабнага сацыяльнага эксперымента ўтапічнага характару без сур'ёзнага абгрунтавання, пралiку шкодных наступстваў, матэрыяльна-тэхнічнай базы.

Мадэрнізацыя сэксуальных адносінаў у Савецкай Беларусі была паскорана штучна. Сацыяльна-эканамічныя і культурныя перадумовы для адыхода ад вялікай традыцыйнай сям'і ў грамадстве ў той час яшчэ не выспелі, што прывяло да абвастрэння шэрагу сацыяльных праблем, перадусім у выглядзе пакінутых жанчын, дзяцей-сірот, а таксама сэксуальнага гвалту. Для жаночай масы – работніцы, сялянкі, савецкай барышні, нэпманцы сэксуальныя эксперыменты ў большасці выпадкаў сканчаліся дзецьмі без бацькоў, абортамі і венерычнымі захворваннямі. Разам з тым, сэксуальная рэвалюцыя 1920-х упершыню паставіла сэксуальнасць у грамадскі дыскурс, назаўсёды пазбавіла інтымную сферу, як і рэлігію, таямнічасці і сакральнасці, змяніла менталітэт жыхароў Савецкай Беларусі ў цэлым.

Сэксуальная рэвалюцыя 1920-х гг., не запатрабаваная большасцю грамадства, але навязаная яму ўладай, была згорнута таксама зверху, у сувязі са зменай палітычнага курса. Усталяванне на працягу 1930-х гадоў таталітарызму суправаджалася курсам на ўмацаванне каманднa-адмністратыўнымі метадамі шлюбу і сям'і, усталяваннем кантролю і падаўленнем сэксуальнага жыцця людзей, ліквідацыяй эратычнага мастацтва і палавога выхавання дзяцей, легальнага сэксуальнага дыскурса ў цэлым. Улада імкнулася давесці народу, што адносіны паміж класамі стаяць вышэй за адносіны паміж паламі.

## Бібліяграфія

Bailes K., *Alexandra Kollontai et la Novelle Morale*, “Cahiers du monde russe et sovietique”, 10–12/1965, vol. 6, p. 472–496.

Calverton V., *The Bankruptcy of Marriage*, New York 1928.

Carleton G., *Sexual Revolution in Bolshevik Russia*, University of Pittsburgh Press 2005.

Fitzpatrick S., *Sex and Revolution: An Examination of Literary and Statistical Data on the Mores of Soviet Students in the 1920s*, “Journal of Modern History”, 50/1978, vol. 50, p. 252–278.

Frankl G., *The failure of the sexual revolution*, London 1975.

Halle F.W., *Women in the Soviet East*, London 1938.

Hobsbawm E., *Revolutionaries*, London 2011.

Stern M., Stern A., *Sex in the Soviet Union*, London 1981.

Willimott A., *The Kommuna Impulse: Collective Mechanisms and Commune-ists in the Early Soviet State*, “Revolutionary Russia”, 1(24)/2011, p. 59–78.

Бебель А., *Женщина и социализм*, Петроград 1918.

Быховский Б., *Генеономические воззрения Фрейда*, “Под знаменем марксизма”, 9–10/1926, с. 190.

Быховский Б., *Метапсихология Фрейда*, Минск 1926.

Быховский Б., *О методологических основаниях психоаналитического учения Фрейда*, “Под знаменем марксизма”, 11–12/1923, с. 158–177.

Бухарин Н., *Об упорядочении быта молодежи*, “Полесская правда”, 122/1925, с. 2.

Вольфсон С., *Лёс чалавечай маралі*, “Полымя”, 6/1926, с. 59–73; 7/1926, с. 65–81.

Вольфсон С. Я., *Социология брака и семьи (опыт введения в марксистскую генеономию)*, Минск 1929.

Вальфсон С. Я., *Сям’я і шлюб у іх гістарычным развіцці*, Менск 1937.

Вольфсон С. Я., *Экзогамия*, “Працы Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту ў Менску”, 20/1928, с. 13.

Ван-де-Вельде Т. Г., *Техника брака. Совершенный брак – опыт исследования и техники*, Харьков 1928.

Врач Е. Ш-н, *Здоровый брак*, “Звезда”, 191/1923, с. 5.

Гапова Е., *Между войнами: женский вопрос и национальные проекты в Советской Белоруссии и Западной Беларуси*, [w:] *Гендерные истории Восточной Европы*, red.: Е. Гапова, А. Усманова, А. Пето, Минск 2002, с. 100–123.

Гаўзэ Ф. І., *Маёмасныя адносіны супругаў па кодэксах законаў аб шлюбе, сям'і і апецы БССР, РСФСР і УССР*, "Працы Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту ў Менску. Факультэт права і гаспадаркі", 21/1928, с. 53.

Герчыкаў І., *Новы асаблівы дакумент соцыялістычнай праватворчасьці*, "Полымя", 2/1926, с. 67–77.

Грыгор'еў А. Д., *Барацьба з праявамі сацыяльнай паталогіі на Беларусі, (1917−1941 гг.)*, "Весці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта", 2/2002, с. 112−116.

Грэдынгер М., *Найважнейшыя моманты ў будучым заканадаўстве аб сям'і*, "Полымя", 8/1926, с. 145–154.

Гужалоўскі А.А., *Сацыяльна-ўтапічны эксперымент: вопыт арганізацыі маладзёжных камун у БССР*, "Беларуская думка", 1/2016, с. 70–76.

Гужалоўскі А., *Замах на сям'ю: сексуальная рэвалюцыя 1920-х г. у БССР на старонках перыядычнага друку*, "Беларускі гістарычны агляд", 1–2 (42–43)/2015, т. 22, с. 89–123.

Гужалоўскі А., *Прастытуцыя ў БССР у часы НЭПа*, "Arche", 9 (142)/2015, с. 243–266.

*Декрет ВЦИК, СНК РСФСР от 18.12.1917 «О гражданском браке, о детях и о введении книг актов гражданского состояния»*. [Электронный ресурс]. Режим доступа: http://www.lawmix.ru/docs_cccp.php?id=8234

*Декрет ВЦИК, СНК РСФСР от 19.12.1917 «О расторжении брака»*. [Электронный ресурс]. Режим доступа: http: //www.lawmix.ru/docs_cccp.php?id=8230.

Дорохина О., Влечение в законе. *Брачное законодательство первых лет советсткой власти*, «Родина: Российский исторический журнал», 5/2009, с. 107–109.

Дулов А. Н., *Брак, семья, материнство в государственной политике БССР 1920-х – первой половины 1930-х гг.*, [w:] *Женщины в истории: возможность быть увиденными*, red.: И. Р. Чикалова, Минск 2004, вып. 3, с. 218–235.

Дулов, А. Н., *Проституция и борьба с ней в Витебске в первые годы Советской власти* [w:] *Женщина. Образование. Демократия: материалы 3-ей международной междисциплинарной научно-практической конференции (8–9 декабря 2000 г.)*, Минск 2001, с. 297–299.

Жыбуль В., *Адлюстраванне праблемы абортаў і прастытуцыі ў беларускай савецкай літаратуры 1920–30-х гг. XX ст.*, [w:] *Terra alba. Homo Venerus: Сэксуальная прастора беларускай культуры*, red.: С. І. Даніленка, Мінск, 2001, с. 186–193.

Жыбуль В., *Сэксуальны гвалт у беларускай савецкай літаратуры*, [w:] *Terra alba. Homo Venerus: Сэксуальная прастора беларускай культуры*, red.: С. І. Даніленка, Мінск, 2001, с. 179–186;

Залкинд А. Б., *Двенадцать половых заповедей революционного пролетариата* [w:] *Философия любви*, Москва 1990, т. 2.

*Заря Запада*, 274/1925, с. 3.

*Заря Запада*, 192/1926, с. 3.

*Звезда*, 75/1922, с. 4.

*Звезда*, 125/1922, с. 4.

*Звезда*, 174/1922, с. 4.

*Звезда*, 162/1924, с. 6.

*Зьвязда*. 253/1928, с. 4.

*Зьвязда*, 267/1928, с. 4.

Иваницкий, *О семье, браке и опеке*, "Камуніст", 122/1926, с. 3.

Иркутов А., *Где мы теряем время и силы*, "Полесская правда", 946/1923, с. 3.

Каліта А., *Ці патрэбна нам сяброўства?*, "Чырвоная зьмена", 44/1929, с. 4.

Каминская Ц., *О ликвидации дел "алиментных"*, "Звезда", 291/1925, с. 3.

*Камуніст*, 123/1926, с. 2.

Каценбоген С. З., *Первобытный человек. Опыт социологического анализа этнографического романа Ренэ Марана "Батуала"*, Минск 1923.

Каценбген С. З., *Спорные вопросы генеономии*, "Працы Беларускага дзяржаўнага унівэрсытэту", 4–5/1923, с. 283–304.

Кон И. С., *Клубничка на березке. Сексуальная культура Росии*, Москва 2010.

Ленин В. И., *Полное собрание сочинений*, Москва 1964, т. 49.

Кіпель Е., *Аснова маралі*, Нью Ёрк 1953.

Кіпель Я., *Эпізоды*, Мінск 2013.

*Кодэкс законаў аб шлюбе, сям'і і апецы Б.С.С.Р.*, Менск 1927.

*Кодекс законов об Актах гражданского состояния, Брачном, Семейном и Опекунском праве*, "Собрание узаконений и распоряжений рабочего и крестьянского правительства", 76–77/1918, с. 933–959.

Коллонтай А., *Дорогу крылатому Эросу! (письмо к трудящейся молодежи)*, "Молодая гвардия", 3/1923, с. 120.

Коллонтай А., *Новая мораль и рабочий класс*, Москва 1919.

Коллонтай А., *Социальные основы женского вопроса*, Санкт-Петербург 1909, с. 219.

Конаплін Н., *Два пытаньні (Да дыскусіі аб шлюбе і сям'і)*, "Полымя", 1926, № 8, с. 157.

Круглов, *Лекция-диспут Жернова*, "Заря Запада", 10/1925, с. 5.

Круглов Ф., *Почему мы ставим половой вопрос*, "Заря Запада", 31/1925, с. 3.

*Крымінальны кодэкс Б.С.С.Р. (прыняты 19 кастр. 1928 г.)*, "Збор законаў і загадаў Рабоча-Сялянскага Ўраду Б.С.С.Р.", 30/1928, с. 897–899.

Курков И., *"Безработица является поводом для проституции" (из документов женотдела ЦК КП(б)Б 1920-х гг.)*, [w:] *Женщины на краю Европы*, red.: Е. Гапова, Минск 2003, с. 130–144.

Курков И., *Гендерный строй белорусской деревни*, "Иной взгляд", март/2000, с. 25–26.

Лавриновская И. В., *Трансформация семейно-брачных установок сельской женщины Беларуси в XX в. (1900–1991 гг.)*, "Научные труды Республиканского института высшей школы". Серия "Исторические и психолого-педагогические науки", 11/2011, ч. 1, с. 111–117.

Лебина Н., *Советская повседневность: нормы и аномалии. От военного коммунизма к большому стилю*, Москва 2015.

Левін А. Х., Чэрвакоў В. Ф., *Абразаньне ў асьвятленьні навуковай экспертызы*, "Працы Беларускага дзяржаўнага інстытуту крыміналёгіі, крыміналістыкі судовай экспэртызы НКЮ БССР", 2/1932, с. 139–178.

Луначарский А., *О быте*, Москва–Ленинград 1927.

Маркс К., Энгельс Ф., *Комуністычны маніфэст*, Менск 1924.

*Матэрыялы па пытанні аб шлюбе, сям'і і апецы*, Менск 1926.

Міхеєва О. К., *Проблеми шлюбних відносин у контексті радянської сімейної політики в Україні на початку 1920-х рр. (за матеріалами газет та фахових юридичних часописів)*, "Історичні та політологічні дослідження", 4 (54)/2013, с. 128–133.

Мусина Н. Е., *Государственная политика и молодежь: проблемы быта, досуга, отношения полов (БССР, 20-е гг. XX в.)* [w:] *Актуальные проблемы из исторического прошлого и современности в общественно-гуманитарных и социо-религиоведческих науках Беларуси ближнего и дальнего зарубежья: материалы Междунар. научно-теоретической конференции*, red.: В. А. Космач, Витебск, 2007, ч. 2, с. 307−310.

Мусина Н. Е., *Девиантное поведение молодежи Беларуси в 1920-е годы*, [w:] *Достижения фундаментальной, клинической медицины и фармации: материалы 64-й юбилейной науч. сессии сотрудников ун-та, посвященной 75-летию его образования*, red.: В. П. Дейкало, Витебск 2009, с. 603−606.

Мусина Н. Е., *Проблемы быта и семейно-брачных отношений в государственной молодежной политике БССР в 20-е гг. XX в.*, [w:] *Достижения фундаментальной, клинической медицины и фармации: материалы 61-й науч. сессии ВГМУ*, red.: А. П. Солодков, Витебск 2006, с. 547−550.

Навай Ф., *Советская модель*, [w:] История женщин на Западе. Становление культурной идентичности в XX столетии», red.: Ф. Тебо, Санкт-Петербург 2015, т. 5, с. 263–288.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь [dalej: НАРБ], ф. 4п, воп. 1, спр. 602, Пратаколы дэлегацкіх сходаў, арк. 81.

НАРБ, ф. 4п, воп. 1, спр. 603, Праткопы дэлегацкіх сходаў, арк. 150.

НАРБ, ф. 4п, воп. 1, спр. 1195, Пратаколы дэлегацкіх сходаў, арк 59.

НАРБ, ф. 4п, воп. 1, спр. 2378, Пратакол паседжання ЦВК БССР, арк. 2.

НАРБ, ф. 4п, воп. 1, спр. 3083, Стэнаграма паседжанняў X з’езда КП(б)Б, арк. 452.

НАРБ, ф. 6, воп. 1, спр. 564, Пастановы ЦВК і СНК БССР, арк. 13–14.

НАРБ, ф. 99, воп. 2, спр. 536, Пратакол жнівеньскай (1926 г.) сесіі ЦВК БССР, арк. 300.

НАРБ, ф. 99, воп. 2, спр. 662, Цыркуляры Наркамюста БССР, арк. 94.

Осипович Т., *Проблемы пола, брака, семьи и положение женщины в общественных дискуссиях середины 1920-х гг.*, “Общественные науки и современность”, 1/1994, с. 166–171.

*Полесская правда*, 286/1926, с. 3.

Понуждаев Д. Н., *Милиция Беларуси в борьбе с проституцией в период новой экономической политики*, “Вестник Воронежского института МВД России”, 3/2013, с. 214–218.

Правдин, *Женщина, которая осмелилась…*, “Звезда”, 91/1927, с. 2.

Пушкарев, А. М. *“Новый быт”: идеологические интерпретции сексуального (по материалам русской художественной литературы и критики 1920-х годов*, “Журнал исследований социальной политики”, 4/2007, т. 5, с. 459–482.

Пушкарев А., Пушкарева Н., *Ранняя советская идеология 1918–1928 годов и “половой вопрос” (о попытках регулирования социальной политики в области сексуальности)*, [w:] *Советская социальная политика 1920–1930-х годов: идеология и повседневность*, red.: П. Романов и Е. Ярская-Смирнова, Москва 2007, с. 199–227;

Райх В., *Сексуальная революция*, Москва 1997.

Рожков А. Ю., *В кругу сверстников: Жизненный мир молодого человека в Советской России 1920-х годов*, Москва 2014.

Романенко И. В., *Трансформация статуса белорусской сельской женщины в XX – начале XXI в.*, Минск 2015.

Серман, *Советы и борьба за быт*, "Полесская правда", 1061/1923, с. 2.

Слюсар Л. І., *Модернізація шлюбу і сім'ї в Україні: особливості радяньского періоду*, "Демографія та соціальна економіка", 1(19)/2013, с. 17–27.

Соловьянов А. П., *Проституция несовершеннолетних в Советской Белоруссии в 1920-е годы*, [w:] *Женщина. Общество. Образование. Материалы 9-ой международной междисциплинарной научно-практической конференции*, Минск 2007, с. 212–215.

Сорокин П., *Американская сексуальная революция*, Москва 2006.

Стайтс Р., *Женское освободительное движение в России. Феминизм, нигилизм и большевизм. 1860–1930*, Москва 2004.

*Статистический ежегодник. Республика Беларусь,* Минск 2015.

Сутрин В. Д., Доропий Н. М., *Проблемы брачно-семейных отношений и полового воспитания в первые годы советской власти*, "Наукові записки Ніжинського державного університету ім. М. Гоголя. Сер.: Психолого-педагогічні науки", 5/2013, с. 261–266.

*Уголовный кодекс РСФСР*, Москва 1924.

Усманова А., *О марксистской теории любви*, "Топос", 3/2010, с. 195–227.

Хили Д., *Гомосексуальное влечение в революционной России. Регулирование сексуально-гендерного диссидентства*, Москва 2008.

Ходзін С. М., *Гендэрны аспект савецкай мадэлі мадэрнізацыі беларускай вёскі (1920-я гады)*, "Гісторыя і грамадазнаўства", 5/2016, с. 3–11.

Цеткин К., *Воспоминания о Ленине*, Москва 1925.

Чикалова И. Р., *Гендерная система (пост)советской Беларуси: воспроизводство и трансформация социальных ролей в публичной и приватной сфере*, "Российские и славянские исследования", 4/2009, с. 51–66.

*Чырвоная зьмена*, 77/1926, с. 4.

*Чырвоная змена*, 235/1929, с. 2.

Шевелев П. В., *Брачные узы по-новому*, "Беларуская думка", 1/2014, с. 95–97.

Шміт З. Ц., *Род і здароўе, шлюб і сям'я*, Менск 1931.

Энгельс Ф., *Паходжанне сям'і, прыватнай уласнасці і дзяржавы*, Мінск 1970.

Яковлева Г. Н., *Общественное и частное в жизни женщин г. Витебска (начало 20-х гг. XX в.)*, [w:] *Женщина. Образование. Демократия. Мат-лы 3-й международной междисциплинарной научно-практической конференции*, red.: Г. И. Шатон, Минск 2001, с. 282–283.

**Sexual revolution in soviet Belarus in the 1920s:
Ideological origins and the legal basis**

All totalitarian regimes which existed in the 20th century tried to use sexual energy of the population like a tool of social engineering. In Soviet Union the Communist Party ideologists strived to change sexuality and sexual behavior of people according to Marxist doctrine. Sexuality in the USSR went through the cycle from unbelievable freedom in the 1920s through the conservatism of Stalinism and a relatively liberal decade of "the developed socialism" to the sexual boom in the end of 1980s – beginning of 1990s. The first decades after Bolsheviks came to power was characterized by unbelievable freedom of even for today. Revolution changes in the sexual behavior took place in the Soviet Russia then in the Soviet Union. Those changes have already got name in contemporary historiography – "sexual revolution". Many aspects of it were described by Russian and Western researchers. Particular facts on the Soviet sexual revolution can be also found in the work of Belarusian researchers, who have studied the gender aspects of the past. The 1920s are traditionally presented in Belarusian historiography in the context of national or new economic policy. The author tried to have a close look at this decade through "unusual" for most Belarusian historians' optics – construction of ideological origins and legal basis for new intimacy and sexual relations. The choice is nonrandom. The first decade after the Bolsheviks' revolution the USSR was the field of experiment, transformation of gender relations. The range of sources is not random too. Printed media as well as the Communist Party and Government officials of the liberal 1920s are openly discussed sexual sphere of human activity.
Key words: sexual revolution, ideology, gender, morality, family and marriage relations, Marxism, love, laws, family code, the actual marriage, divorce